פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט אייך!

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЭЗЕТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ПЯТНІЦА
11 верасьня 1931 г.
№ 210 (3299)

Узьняць калгасную вытворчасьць

У барацьбе за сацыялістычную рэканструкцыю сельскае гаспадаркі мы атрымалі буйнейшыя, сусьветна-гістарычнага значэньня перамогі. Сацыялістычны сэктар заваяваў пераважную ролю ў сельска-гаспадарчай вытворчасьці, дасягнуў абсалютнай перавагі над індывідуальным сялянскім сэктарам. Калгаснае сялянства зрабілася цэнтральнай фігурай у земляробстве, асноўным вытворцай збожжа і важнейшай тэхнічнай сыравіны.

У рашучай барацьбе з правым і «левым» апартунізмам нам удалося перакрыць тыя тэмпы сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, якія былі даны зьездам партыі і пастановамі ўраду.

У гэтых новых абставінах, якія стваралися на вёсцы, на першы плян высунулася задача арганізацыйна-гаспадарчага ўзмацненьня калгасаў і якаснага разьвіцьця калгаснай вытворчасьці. З гэтым цяпер—цэнтр важкасьці ўсёй работы па завяршэньні суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі на гэтай аснове кулацтва як клясы.

Трэба зразумець, што кулак, якому не ўдалося звонку затрымаць перамогі ны рух калектывізацыі, якому не ўдалося затрымаць мільённыя масы сялянства ад уступаньня ў калгасы, кулак усімі сіламі і сродкамі спрабуе ўзарваць калгасы ўнутры, ня даць калгасам арганізацыйна-гаспадарча ўзмацніцца. Барацьба з кулаком на даным этапе ў асноўным і заключаецца ў арганізацыйна-гаспадарчым узмацненьні калгасаў і ўзьняцьці якасьці калгаснай вытворчасьці.

Аўладаць калгаснай вытворчасьцю!,—вось сурёзьнейшая і адказьнейшая задача, якая на першы плян высоўваецца перад кожнай партыйнай арганізацыяй, перад кожным РВК, сельсаветам, перад кожнай дэпутацкай групай.

Аўладаць калгаснай вытворчасьцю, арганізаваць жывое, аперацыйнае, каштрэтнае кіраўніцтва калгасамі, вырашыць задачу якаснага ўзьняцьненьня калгасаў—вось у чым зараз цэнтр важкасьці работы па завяршэньні сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Трэба сказаць, што мы з гэтай задачай, задачай аўладаньня калгаснай вытворчасьцю пакуль-што спраўляемся далёка нездавальняюча. Праўда, посьпех веснавой пасеўнай кампаніі, у асноўным недрэнныя вынікі ўборачнай кампаніі, асабліва на ільняных палёх,—усё гэта кажа, што мы зрабілі значны крок наперад. Але з другога боку, абсалютна слабыя тэмпы асеньняй сяўбы і зьлевага ворыва, нездавальняючы ход камплектаваньня і будаўніцтва ў жывёлагадоўчых калгасах і інш. сьведчаць аб вялікай рабоце, якая стаіць яшчэ перад намі ў гэтай галіне.

Важнейшым ключом да вырашэньня задач якаснага ўзьняцьця калгаснай вытворчасьці зьяўляецца мабілізацыя вытворчай актыўнасьці калгаснай масы і гаспадарчай ініцыятывы калгасу.

Па якой лініі павінна ісьці гэта мабілізацыя? Яна павінна ісьці па лініі барацьбы за рашаючыя вучасткі калгаснай вытворчасьці. Зараз на першы плян выпячваюцца задачы ўдарнага скончэньня ўборкі, бадзёрага разгорту ванньня асеньняй сяўбы і ўзьняцьця зябу, камплектаваньня калгасных статкаў, будаўніцтва жывёў і сьвінарнікаў. Вось вакол гэтых задач і трэба ўзьнімаць актыўнасьць і вытворчую ініцыятыву калгасьнікаў.

Возьмем, да прыкладу, такое пытаньне, як будаўніцтва калгасных сьвінагадоўчых форм. З многіх раёнаў паведамляюць, што гэта будаўніцтва тармозіцца або зрываецца з-за адсутнасьці сьвіней і матачнага матар'ялу, з-за адсутнасьці цьвікоў, жалеза... Здолець узьняць калгасьнікаў на адшуканьне і скарыстаньне мясцовых буданічных матар'ялаў, здолець узьняць калгасьнікаў на тое, каб кожны з іх даўбы па 1-2 сьвінні на ўкамплектаваньне свае фэрмы—вось чым, нарэшце, у вялікай ступені будзе вызначаць аўладаньне калгаснай вытворчасьцю.

Зусім зразумела што аўладаньне калгаснай вытворчасьцю і яе ўзьняць цё нямысьліма без сыстэматычнай упартай работы за лепшую арганізацыю працы за ўвядзеньне зьдзельшчыны, пастаноўку вучоту працы. Без барацьбы за гэтыя стрыжнёвыя вучасткі немысьліма барацьба за ўзьняцьце калгаснай вытворчасьці.

Буйнейшае значэньне ў гэтай сувязі набывае пытаньне аб разьмеркаваньні ўраджаю і калгасных даходаў. У наасобных калгасах лічэ да гэтага часу на выкарчавана практыка ядоцкага разьмеркаваньня ўраджаю і даходаў. Ядоцкі прынцып, гэта дробнабуржуазная ўраўнілаўка зьяўляецца адной з формаў кулацкай барацьбы супроць калгаснага руху. Без рашучай ліквідацыі рашткаў ядоцкага разьмеркаваньня ўраджаю і даходаў немагчыма ўсур'ёз гаварыць аб арганізацыйна-гаспадарчым узмацненьні калгасаў і якасным узьняцьці калгаснай вытворчасьці.

Мы вышэй сказалі, што на даным этапе цэнтральнай задачай барацьбы за завяршэньне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі зьяўляецца задача арганізацыйна-гаспадарчага ўзмацненьня калгасаў. Ці значыць, гэта, што мы павінны спыніць барацьбу за далейшае ўцягненьне бяднацка - серадняцкага індывідуальнага сялянства ў калгасы, што мы павінны ў гэтых адносінах пакласьціся на самацёк? Ані не бывала! Толькі правы апартуніст можа так ставіць пытаньне, толькі кулацкі агент можа рабіць такія вывады. Іменна, аўладаньне калгаснай вытворчасьцю, іменна арганізацыйна-гаспадарчае ўзмацненьне калгасаў і якаснае ўзьняцьце калгаснай вытворчасьці адыграе ролю мацнейшага агітатара за калгасны рух, іменна гэта пераканае і тых беднякоў і сераднякоў, якія пакуль-што ня ўступілі ў калгасы, але якія заўтра зробяцца калгаснікамі.

Іменна ў барацьбе, рашучай і бязьлітаснай, з правым апартунізмам і «левымі» тэндэнцыямі ў калектывізацыі, іменна ў барацьбе за хуткі і эфэктыўны ўздым калгаснай вытворчасьці мы забясьпечым у найкарацейшы тэрмін суцэльную калектывізацыю сельскай гаспадаркі і ліквідацыю на гэтай аснове кулацтва як клясы.

Ваенна-палявымі судамі, крывавымі расправамі над палітзьняволенымі,

польскай Сталыпіншчыне не затрымаць пераможнага маршу Чырвонага Кастрычніка ў Польшчы

Крывавы закон фашысцкага ўраду—у дзейнасьці

СЭРЫЯ ВАЕННА-ПАЛЯВЫХ СУДОЎ У ЛЬВОВЕ

ВАРШАВА, 9 верасьня. Як паведамляе сацыял-фашысцкі „Работнік“ з 10 верасьня ў Львове пачынаецца вайскова-палявы суд над украінцамі.

„Дня 10 б. м.,—піша „Работнік“,—адбудзецца працэс па справе ўкраінца Райцова, які абвінавачваецца ў падпале і сабатажы; дня 14 б. м. адбудзецца працэс над Рышыцам і іншымі, якія абвінавачваюцца ў здрадзе дзяржаве; дня 17 б. м.—над Кастусём Сельскім, які абвінавачваецца таксама ў здрадзе; дня 22 б. м.—над Янкам Мікуле і 7 таварышамі, якія абвінавачваюцца ў здрадзе дзяржаве і падпалах; 12-X—працэс над Янкам Дрожэ і іншымі абвінавачанымі таксама ў здрадзе дзяржаве і падпалах; дня 19-X—над Краўцовым і 13 іншымі асобамі абвінавачанымі ў здрадзе дзяржаве і падпалах“.—Такая сэрыя вайскова-палявых судоў намячаецца так сказаць у плянавым парадку фашысцкімі ўладамі на бліжэйшыя дні толькі ў Львове.

Хто знаходзіцца на лаве падсудных, над якімі завісла сьмяротная пятля фашысцкіх катаў, рэвалюцыйныя рабочыя і сяляне. На лаве падсудных тыя, што змагаюцца з дыктатурай голаду і тэрору. Польская фашысцкая юстыцыя супроць гэтых нявінных ахвяр высоўвае абвінавачаньне ў пераважнай большасьці агульныя „здрады“. Пад абвінавачаньне „здрада“ можа быць падведзена любое абвінавачаньне рэвалюцыянэра. І за гэта расстрэл бяз сьледзтва,—па законнаму прыгавару ваенна-палявога суду—расстрэл.

Такія законы польскай фашысцкай „рэспублікі“ тэрору. (Улас. інфарм.).

Агульны сход вучняў 33-й польскай школы ў Менску шле гарачае прывітаньне рэвалюцыйнаму пралетарыяту Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Сход з абурэньнем пратэстуе супроць зьверскіх катаваньняў і зьдзекаў над палітзьняволенымі ў фашысцкай Польшчы.

На тэрор адказваем коратка палітэнэрску: «Памыляецеся, паны-фашысты! Тэрорам нельга падушыць рэвалюцыю. Пралетарскага суду вам не мінаваць. Усе магчымыя для нас сродкамі будзем змагацца за сусьветную пралетарскую рэвалюцыю. Канкрэтна ў гэтай справе пастанаўляем:

1. Уступіць стопроцантна ў рады МОПР'у.
2. Арганізаваць збор сродкаў для дапамогі палітзьняволеным.
3. Перавыканаць свой прамфінпкян.
4. Абвясьціць заклік у піянэр-арганізацыю пад лёзунгам: «наш адказ фашыстам» і пяпоўніць рады камсамолу найлепшымі піянэрамі нашага атраду.
5. Узмацніць інтэрнацыянальнае выхаваньне.

ПРАТЭСТУЮЦЬ МІЛЬЁНЫ

супроць крывавай расправы польскага фашызму над рэвалюцыянэрамі, супроць забойстваў палітзьняволеных

ВІЦЕБСК, 7-IX. (Белта). Зьлёт польскай рабочай і калгаснай моладзі Віцебшчыны зьвярнуўся з наступнай адозвай да працоўнай моладзі Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны:

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Першая канфэрэнцыя польскай работніцкай калгаснай моладзі Віцебшчыны ў зьезду з 17-м МЮД'ам шле вам гарачае пралетарскае прывітаньне. Дзякуючы адзінаправільнай Ленінскай нацыянальнай палітыцы польская працоўная моладзь БССР пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і Ленінскага камсамолу зрабіла вялізарныя дасягненьні на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, калектывізацыі польскай вёскі, ліквідацыі кулацтва як клясы, а таксама дабілася значных посьпехаў на фронце культурнай рэвалюцыі.

Польская працоўная моладзь нараўне з працоўнай моладзьдзю іншых нацыянальнасьцяй прымае актыўны ўдзел у барацьбе за пуск у гэтым годзе 518 фабрык і заводаў, а таксама 1040 МТС. У гэтым годзе толькі ў адным Віцебску мы пусьцілі ў рух 5 фабрык на 15 тысяч рабочых, дзе працуе значная колькасьць польскай моладзі. Калектывізацыя Віцебскага раёну праведзена на 70 проц., З 26 польскіх сельсаветаў БССР суцэльна калектывізавана 15.

У нас у БССР польская працоўная моладзь мае шырокі доступ у сярэднія і вышэйшыя школьныя ўстановы. На тэрыторыі БССР знаходзіцца 277 польскіх школ. Тры рабочыя факультэты, пэдагагічны тэхнікум, польская сэкцыя пры Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце, польская сэкцыя пры Пэдагагічным Інстытуце ў Гомелі, Палітычна-асьветны тэхнікум, польскі сэктар пры Беларускай Акадэміі Навук, рад вячэрніх школ, польскі тэатр і г. д.

Сетка пачатковых школ і школ для малапісьменных разам са школамі для нясьпісьменных будзе штораз узрастаць і да мая 1932 г. зробім БССР краінай агульнай пісьменнасьці.

У той час, калі Савецкі Саюз ідзе па шляху перамог сусьветнага гістарычнага значэньня, калі ў нас зусім ліквідавана беспрацоўе і перамежна будуецца сацыялізм, — фашыцкую Польшчу разьядае гніль глыбокага эканамічнага крызісу. Рабочая кляса, працоўная моладзь, у Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны засуджана на беспрацоўе, жабрацтва і голад.

СССР мае шырокі росквіт сацыялістычнай культуры па зьмесьце і нацыянальнай па форме ўсіх нацыянальнасьцяй, у фашыцкай Польшчы,—на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне панує звычуваны нацыянальны ўціск. Культурна-асьветныя ўстановы засталіся ліквідаванымі і разгромленымі. Карныя экспэдыцыі, гвалты, крывавыя катаваньні, казэматы, беспрацоўе—вось што дала замест працы, хлеба, зямлі і школ фашыцкая Польшча.

Фашыцкая Польшча бачыць выхад з цяперашняга крызісу ва ўзброеным нападзе на СССР, на адзіную бацькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту.

Таварышы, маладыя рабочыя і працоўныя сяляне! Мы сьвяткуем сёньня XVII міжнародны юнацкі дзень. У гэты дзень павінны выйсьці на вуліцу пад сьцягам Кампартыі і КСМ Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны на барацьбу з фашызмам, на барацьбу з сацыял і нацыянал-фашыстамі, гэтымі здраднікамі рабочае клясы. У гэты дзень узмоцнім работу на абарону СССР, на абарону правоў рэвалюцыйных вязьняў.

Толькі пад сьцягам Кампартыі, пры міжнародным клясавай салідарнасьці рабочая кляса ў барацьбе за пралетарскую рэвалюцыю пераможа.

Прэч з нападам на СССР. Прэч з польскім фашызмам і яго агентамі ППС.

Працоўная моладзь у дзень XVII МЮД'у ў рады КСМ. Нехай жыве камсамол Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Нехай жыве польская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка!

***

Мы, калгаснікі калгасу «Завет Ільліча», Прапойскага раёну, выказваем свой гарачы пратест супроць фізычнага зьнішчэньня 10 тысяч палонных фашызму—лепшых сыноў рабочых і сялян. Мы патрабуем спыніць зьдзекі над палітзьняволенымі, скасаваць крывавы фашысцкі рэгламант.

Таварышы рабочыя і сяляне Польшчы! Шчыльней рады вакол сьцягаў КПП! Рыхтуйцеся да надыходзячых баёў супроць дыктатуры фашызму! Рыхтуйцеся да апошніх рашучых баёў за Савецкую Польшчу!

У адказ на зьверствы польскага фашызму мы ўзмацняем работу па выкананьні плянаў калгаснага будаўніцтва, абавязваемся своячасова выканаць плян асеньняй сяўбы.

Рукі прэч ад палітзьняволеных—нашых братоў! Уносім у фонд дапамогі палітзьняволеных 93 рублі.

***

Мы, рабочыя і служачыя Мсьціскага вучлесгасу, заяўляем: хоць польскі фашызм імкнецца фізычна зьнішчыць лепшых сыноў рабочых і сялян Польшчы—палітзьняволеных, хоць ён хоча ў крыві затапіць рэвалюцыйны рух Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны, але гэтага яму ня ўдасца. Польскі фашызм дажывае свае апошнія дні.

Мы з абурэньнем пратэстуем супроць тых нячуваных зьдзекаў над палітзьняволенымі, якія твораца ў турмах Польшчы.

У адказ польскаму фашызму мы ўсе, як адзін, уступаем у рады МОПР'у, адлічаем аднадзённы заробак у фунд дапамогі палітзьняволеным, адпрацоўваем адзін суботнік у карысьць МОПР'у і адзін суботнік у фонд матэрыяльнай паранчасьцей.

Нехай ведаюць польскія паны, што мы не дамо загінуць нашым закардонным братом.

5 лёназаводаў пусьціць 20 верасьня

Мы прад'яўляем рахунак Лёнаканапляводбуду

На ўдарных будоўлях лёназаводаў няма апэрацыйнага кіраўніцтва

ТРЫВОЖНЫЯ СЫГНАЛЫ З МЕЖАНУ

Мяжа. (Ад нашага спэцкора). Аптымістычныя завярэньні адказных раённых работнікаў, што будаўніцтва лёназаводу праходзіць пасьпяхова, нажаль не пацьвярдзіліся. Гэтыя завярэньні паказалі толькі што раён ня ведае, як сапраўды ідзе будаўніцтва.

Будаўніцтвам заводу ніхто ня кіруе. Начальнік будаўніцтва тав. Канафалаў паехаў у камандыроўку 31 жніўня. Усьлед за ім назаўтра накіраваўся і тэхнік. Да сёньняшняга дню ніхто з іх не вярнуўся. Кіраўніцтва будаўніцтвам ускладзена на дзесятніка—Клюева.

Дысцыпліна на будаўніцтве вельмі слабая. Кожны робіць, што хоча. Выключэньнем зьяўляецца толькі адна брыгада манцёра тав. Фінагенава, якая працуе сумленна, па ўдарнаму, але намаганьні брыгады тав. Фінагенава ўпіраюцца ў прарывы на іншых вучастках.

„Маленькія недахопы“ мэханізму

Вось факты, якія характарызуюць галавацяпства цэнтральных і мясцовых будаўнічых арганізацый. Заводу прысылалі дзьве трасілкі. Не знайшлося чалавека, які падабраў-бы патрэбную трасілку і каб ня трэба было весьці са ст. Бычыхі за 35 кілёмэтраў лішнюю трасілку, бо яна пэўна належыць другому заводу. (Тут мяркуюць, што адна трасілка належыць Бычыхінскаму лёназаводу ,які будуецца каля станцыі Бачыхі).

Замест патрэбных рабочых, зборачных чарцяжоў для швінг-турбіны «Моноблёйт», прысылаі чарцяжы для швін-турбіны «Бінглера». Манцёр прымушаны рабіць борку па памяці. Але гэта вялікая рызыка .

На ст. Бычыха ляжаць 25 шт. чыгунных труб, адрасаваных Межанскаму лёназаводу. А тут ламаюць галаву «навошта нам гэтыя трубы?» Такім чынам, патрэбны недае матар'ял ляжыць мёртвым капіталам.

Чамусьці прысылалі 2 экз. каштарысаў на рабочую сілу па мантажы замест аднаго. А каму небудзь і ня хопіць каштарысу.

Імпартная швінг-турбіна «Моноблёйт» была адрасавана заводу непасрэдна Масквой пад назвай... зерня ачышчальнай машыны. Але прымаючы пад увагу, што заводу такая машына не патрабуецца—на працягу месяца швінг-турбіна ня выкуплялася, а потым здагадаліся паслаць манцёра паглядзяць, што гэта за зерняачышчальнік. Завод прымушан быў заплаціць чыгунцы больш 1.000 руб. за хаваньне гэтага «зерняачышчальніка». Больш таго, разам з турбінай быў паказаны так званы «харчавальны транспацёр» (бясконцавы гумовы пас). Бяз гэтага транспарцёра пусьціць машыну нельга, а дастаць другі вельмі цяжка. Рука школьніка ўлічыла гэта і выразала з транспарцёру кавалак у 30 см. Паправіць яго немагчыма.

З мантажных струмантаў прысылалі толькі малаткі, ватэрпас мэталёвы і 1 швэцкі ключ (а патрэбна 5 шведскіх ключоў і адзін французкі). Клісмэйсь цераў патрэбна максімум 5 штук, а да сталі—20. Затое ня шлюць іншых струмантаў, якія вызначаны па спэцыфікацыі і без якіх зрываюцца мантажныя работы.

Усе гэтыя непаладкі, нераспараджальнасьць лёнаканапляводбуду і мясцовых арганізацый прыводзяць да зрыву мантажных работ на заводзе і адцягваюць пуск яго.

Дзе-ж лёкамабіль?

Ня гледзячы на тое, што завод павінен быць пушчаны праз 10 дзён, да гэтага часу няма лёкамабілю і ўсяго трансмісійнага абсталяваньня. З прысылкай лёкамабілю ня спяшаюцца. Вось факт, які характарызуе «рупліваасьць» будаўнічага вучастку (Віцебск). Начальнік вучастку тав. Розэмблюм піша заводу тэрміновую адносіну з прапановай паведаміць, куды выслаць лёкамабіль. Гэта тэрміновая валакіта тав. Розэнблюма адняла 5 дзён, бо паперка прыйшла на завод толькі 1 верасьня. Начальнік будаўнічага вучастку ня можа на месцы даведацца, што ў Мяжу лёкамабіль можна прывесьці толькі па дарозе—ст. Гарадок-Мяжа.

Між іншым з-за адсутнасьці лёкамабіляў і чарцяжоў нельга прыступіць да будаўніцтва падмурку. А гэта вельмі ўплывае на тэрмін пуску заводу, бо па тэхнічных умовах бэтоны падмурак павінен сохнуць каля 2-х тыдняў. Толькі пасьля гэтага можна прыступіць да ўстаноўкі лёкамабіля. Вось ліча, калі можна разьлічваць на пуск заводу, калі да гэтага часу лёкамабілю яшчэ няма.

Рабочае забесьпячэньне пастаўлена вельмі дрэнна. У сталоўцы не гатуюць гарбаты. Рабочыя заводу не атрымліваюць гарбаты ні рана, ні ўвечары. Райспажыўсаюз не клапоціцца аб гэтым. Калі няма цукру, дык можна быб-б прыслаць цукерак. Апроч гэтага і абеды пагоршыліся ў сталовай.

4 балевых задачы

Што неабходна для тэрміновага пуску заводу? Па-першае, неабходна зламаць бюракратызм і апартунізм тых арганізацый, якія забясьпечваюць завод усім патрэбным.

Па-другое на будаўніцтве неабходна ўстанавіць стадае і цьвёрдае адміністрацыйнае і тэхнічнае кіраўніцтва. Нельга дапускаць такіх фактаў, калі на сёньня завод застаўся зусім без кіраўніцтва.

Па-трэцяе неабходна ўшчыльніць рабочы дзень на будаўніцтве на аснове сапраўднай зьдзельшчыны. Зараз тут пануе такзваная 5-дзённая зьдзельшчына. Гэта значыць даюць напрыклад, брыгадзе па пабудове даху 25 руб. Вось яны і крыюць. калі хочуць.

Па-чацьвёртае неабходна ўзмацніць дысцыпліну. Бываюць выпадкі, калі муляры да паловы дзесятага туляюцца, ні чога ня робяць, ня гледзячы на тое, што мулярскія бэтонныя работы зьяўляюцца ўдарнымі. Некаторыя муляры позьняцца, але ніхто не зварочвае ўвагі на гэта.

Штодзённая насьцешная газэта «За работу па новаму», якая сёньня выйшла першым нумарам, ужо ўзьняла пытаньне аб узьняцьці працоўнай дысцыпліны, аб ушчыльненьні рабочага дню, аб сацспаборніцтве і ўдарніцтве. Заўтра штодзённа выклікае брыгаду мулярой заключыць дагавор з брыгадай манцёраў на ўдарнае скончэньне работ на сваіх вучастках.

Рабочыя сустрэлі сваю газэту з вялікай зацікаўленасьцю. Ужо ў першы дзень паступіла заметак і рацыяналізатарскіх прапаноў, якіх хопіць на два нумары газэты.

Неабходна зараз-жа прыступіць да ліквідацыі ўсіх прарываў на будаўніцтве Межанскага лёназаводу. 20 верасьня завод павінен быць пушчаны. Лёнаканаплявуд, раённыя арганізацыі і адміністрацыя заводу павінны павярнуцца тварам да будаўніцтва.

Мантаж турбіны скончаны

МЯЖА. (Ад нашага спэцкора па тэлеграфе). Мантаж турбіны на Межанскім лёназаводзе скончан. Мулярна-бэтонныя работы выкананы на 50 проц. Да гэтага часу няма вестак, калі будзе прысланы лёкамабіль трансмісійнае абсталяваньне, мантажнікі без спэцовак, але Віцебская кантора бязьдзейнічае.

Брыгады будаўнікоў ня маюць штодзённых апэрацыйных заданьняў, работа праходзіць самацёкам.

Тэрміну пуску заводу зрываецца.

Выходзім на штурм прарываў

Абвяшчаем завод ударным

(З пастановы агульнага сходу рабочых і тэхпэрсаналу Краснапольскага лёназаводу)

Рабочыя і тэхпэрсанал Краснапольскага лёназаводу ,абгаварыўшы адозву ЦП саюзаў і радакцыі газэты «Савецкая Беларусь» аб своячасовым пуску лёназаводаў першай чаргі, у тым ліку і свайго, бяруць на сябе наступныя абавязкі:

На працягу 5 дзён ліквідаваць усе прарывы на фронце будаўніцтва лёназаводу і да 20 верасьня закончыць цалкам будаўніцтва заводу і мантажу.

З 5 верасьня па 20 абвясьціць штурм «15-ці дзён» па своячасоваму пуску лёназаводу.

Вытворчасьць і прадукцыйнасьць працы падвысіць на 30 проц., ліквідаваўшы ўсе прагулы, спазьненьні на работу і г. д.

Усю работу перавесьці на брыгадную зьдзельшчыну і наладзіць кожны дзень улік работы брыгад.

Кожны рабочы бярэ на сябе абавязкі завербаваць яшчэ аднаго рабочага на будаўніцтва.

Наладзіць скразны кантроль над ходам будаўніцтва і арганізаваць ударныя брыгады рэдакцыі газ. «Савецкая Беларусь».

Завод абвясьціць ударным і выклікаць на сацспаборніцтва Крупскі лёназавод першай чаргі.

Старшыня сходу ЦАРАЎ.
Сакратар КОСЬЦІК.

Канчаюць уборку лёну.

Дайце заводу абсталяваньне

Дуброўна. (Белта). Будаўніцтва Дуброўенскага лёназаводу набліжаецца да канца. Да 1 кастрычніка корпус заводу і памяшканьне складу пад лён будуць поўнасьцю скончаны, але з прычыны адсутнасьці абсталяваньня нельга прыступіць да мантажу.

Зараз прыслана толькі адна дынама, нічога невядома, калі будуць прысланы лёкамабіль і турбіны.

Такое становішча стварае рэальную пагрозу своячасоваму пуску лёназаводу.

180 мільёнаў працоўных Кітаю—пад пагрозай галоднай сьмерці

—такія вынікі панаваньня імпэры ялістычных драпежнікаў

ШАНХАЙ, 7-IX. У Шанхаі лічаць, што лік ахвяр паводкі, патрабуючых неадкладнай дапамогі дасягае 180 млн. Ад паводкі пацярпела 300 паветаў у 17 правінцыях. Найбольш пацярпелі правінцыі Хубэй, Анкуэй і Цзянсу. Становішча ў Хубэі за апошнія дні яшчэ больш пагоршылася ў сувязі з тым, што вада ў Вялікім канале зноў паднялася, і многія гарады, якія знаходзяцца ўздоўж каналу, зноў апынуліся пад пагрозай. Паводле паведамленьняў з поўначы, разьліў ракі Жоўтай правёў яшчэ горшыя парушэньні, чым разьліў Янцзы. Рэйтэр лічыць, што ў басэйне ракі Жоўтай ад паводкі загінула 1 млн. чалавек.

Нанкінскі ўрад у дапамогу пацярпеўшым рашыў выпусьціць пазыку толькі ў 30 млн. даляраў, замест мяркуемых 80 млн.

Паводле паведамленьня з Бэрліну, Цэнтральнае бюро Міжнароднага камітэту дапамогі пацярпеўшым ў Кітаі апублікавала адозву да ўсіх працоўных сьвету з прапановаю пачаць збор ахвяраваньняў.

Рэвалюцыйныя японскія студэнты ў Бэрліне, рад японскіх і карэйскіх пісьменьнікаў, міжнародны саюз пралетарскіх акторaў і рад іншых арганізацый заявілі аб сваёй гатоўнасьці дапамагчы рабоце камітэту. 10 верасьня ў Бэрліне адбудзецца арганізаваны Міжрабпомам масавы мітынг, прысьвечаны паводцы ў Кітаі.

ШАНХАЙ, 7-IX. Барацьба паміж Нанкіным і Кантонам усё яшчэ характарызуецца, з аднаго боку, пасылкай узаемных дэлегацый, намацваючых глебу для прымірэньня, а з другога боку,—падрыхтоўкай да ваенных дзеяньняў. «Чайна Прэсс» паведамляе, што аб'яднаныя гуандунскія і гуансійскія часьці пад камандваньнем Чан Фагуя і Бай-Цзун-чы перайшлі межы Гуансі і ўступілі ў Хунань, маючы намер прасоўвацца далей на поўнач. «Мінь боа» паведамляе, што Чан Кай-шы таксама аддаў загад хунаньскім часьцям пачаць наступленьне супроць кантонцаў. У Наньчане арганізавана ваенна-паветраная база, адкуль будуць прадпрыняты паветраныя атакі на Гуандун.

ТОКІЕ, 28-VIII. Цянзінская кітайская газэта «Дагун-бао» зьмяшчае артыкул аб росьце камуністычнага руху ў Паўночным Кітаі, на падставе данясеньняў жандармскага кіраўніцтва ў Бэйрыне. Артыкул аддае асаблівую ўвагу росту камуністычнага ўплыву ў воінскіх часьцях.

У радзе часьцей арганізаваны камуністычныя ячэйкі, якія дзейнічаюць з вялікім посьпехам. Значны ўплыў аказалі таксама салдаты, якія былі ў палоне ў СССР у час савецка-кітайскага канфлікту. Многія камуністычныя ячэйкі ў вайсковых часьцях арганізаваны іменна гэтымі салдатамі. Яны пасылалі таксама сваіх прадстаўнікоў у Шаньсі, Апошняе паўстаньне ў Фупіне (Шаньсі), дзе быў створан савецкі ўрад і сфармаваны корпус Чырвонай арміі, а таксама паўстаньне ў мукдэнскіх часьцях, раскватэраваных ля Бэйпіну, зьяўляюцца простым рэзультатам дзейнасьці былых палонных.

У час арышту ў некаторых салдат знойдзены нумары нелегальнага камуністычнага часопісу «Прыяцель салдата», які мае вялікае распаўсюджаньне ў войску.

Як ужо паведамлялася, камуністычны ўплыў таксама рэзка ўзмацніўся сярод рабочых Бэйпін-мукдэнскай чыгункі. Мукдэнскі камітэт гаміндану ў сувязі з гэтым пастанавіў арганізаваць свой жоўты прафсаюз чыгуначнікаў.

Чырвонаштандарныя асьветнікі БССР выступілі ў паход

за поўнае ажыцьцяўленьне гістарычнай пастановы ЦК УсеКП(б)

Асьветнікі БССР выклікалі на сацспаборніцтва асьветнікаў Заходняй вобласьці. Мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва выканаем і перавыканаем культплян 1931-32 году

Чырвонаштандарныя асьветнікі Савецкай Беларусі ў адказ на гістарычную пастанову ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе і пастанову ЦК КП(б)Б па пытаньні культурнага будаўніцтва на 1931-32 г. выступаюць у бой за поўнае выкананьне дырэктыў партыі, за падняцьце якасьці работы ўсіх культпалітасьветных устаноў.

Асьветнікі БССР выклікалі на сацспаборніцтва на лепшыя колькасныя і якасныя паказьнікі ў выкананьні задач 1931-32 навучальнага году—асьветнікаў Заходняй вобласьці.

Чырвонаштандарныя асьветнікі БССР узялі на сябе наступныя абавязацельствы:

1. Ахапіць першапачатковым абавязковым навучаньнем 679.856 дзяцей ва ўзросьце 8-11 год, для чаго адкрыць 15.840 груп 1-га канцэнтру, і абавязковым навучаньнем на базе 7-годкі—185.242 чалавека ў 4.344 групах II-га канцэнтру,. 27.000 падлеткаў—900 груп.

2. Да 1 мая 1932 г. ператварыць БССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці, ліквідаваўшы няпісьменнасьць сярод рабочых і прызыўнікаў поўнасьцю да 1-га кастрычніка 1931 г., для чаго ахапіць лікпунктамі ня менш 300.000 няпісьменных і ня менш 480.000 нал. ва ўзросьце да 35 год ахапіць школамі для малапісьменных. Саюзная арганізацыя бярэ на сябе абавязацельства давесьці армію культармейцаў да 20.000 чалавек. Работа па ліквідацыі няпісьменнасьці будзе праводзіцца пад лёзунгам: «Ніводнага асьветніка, ня прымаючага ўдзелу ў ліквідацыі няпісьменнасьці».

3. У мэтах далейшай барацьбы за політэхнічную школу правесьці наступнае:

а) Скончыць да 1 кастрычніка прымацаваньне школ да прадпрыемстваў, МТС, калгасаў і саўгасаў.

б) Да 1 студзеня і 1 мая правесьці масавую грамадзкую праверку і самаправерку выкананьня дагавораў, заключаных школамі з прадпрыемствамі, МТС, калгасамі, саўгасамі, шырока асьветлёўшы выкананьне дагавораў на сходах рабочых, калгаснікаў, у мясцовым і цэнтральным друку.

в) Арганізаваць ва ўсіх раёнах і гарадох апорныя вопытныя школы па політэхнізацыі.

г) Правесьці шырокія канфэрэнцыі рабочых і калгаснікаў па прапрацоўцы рашэньняў Усерасійскай канфэрэнцыі па вытворчым навучаньні і аб далейшых практычных мерапрыемствах па політэхнізацыі.

д) У мэтах сапраўднага прыцягненьня пралетарскай грамадзкасьці і інжынэрна-тэхнічных сіл да справы політэхнізацыі школ, арганізаваць ва ўсіх гарадох і раёнах гарадзкія (раённыя) штабы па політэхнізьме, такія-ж штабы стварыць на ўсіх прадпрыемствах, МТС, саўгасах і больш буйных калгасах.

Не пазьней, як да 1-X-31 г. выдаць сумесна з Наркамасьветы палажэньне аб гэтых штабах.

4. Дабіцца, каб у апараты гарадзкіх і раённых органаў народнай асьветы было ўцягнута для работы ня менш 3-х рабочых-ударнікаў, а ў гарадзкіх школах ня менш аднаго—ў парадку сацсумяшчальнасьці, скарыстаўшы іх за адказнай кіруючай работе.

5. Да 1-га лістапада падвесьці вынікі і вывучыць вопыт работы вытворчых нарад, на падставе чаго не пазьней 15-XI выдаць дыфэрэнцыраванае палажэньне аб вытворчых нарадах па асобных тыпах культпалітасьветустаноў, выходзячы з рашэньняў V-га Пленуму УсеЦСПС.

6. У галіне падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі педкадраў:

а) У 1931-32 навучальным годзе ахапіць завочным і вячэрнім навучаньнем усіх пэдагогаў, ня маючых спэцыяльнай вышэйшай і сярэдняй пэдадукацыі, для чаго: адкрыць Дзяржаўны Інстытут падвышэньня кваліфікацыі, скарыстаць для гэтай работы ўсе існуючыя пэдтэхнікумы і пэдвузы, ператварыць раённыя апорныя школы ў цэнтр мэтадычнай дапамогі настаўніцтву.

б) Не пазьней сьнежня месяца адкрыць падрыхтоўчыя курсы пры ўсіх пэднавучальных установах з мэтаю забесьпячэньня вясеньняга набору ў гэтыя ўстановы адпаведнай рабочакалгаснай прослойкі.

в) Сіламі асьветнікаў, у парадку грамадзкай работы, падрыхтаваць 1.500 работнік і калгаснік для работы ў дашкольных установах.

7. Правесьці ў кастрычніку месяцы месячнік праверкі дагавораў па сацыялістычным спаборніцтве і ўдарніцтве ў культустановах, увязваючы гэту работу з давядзеньнем культпляну 1931-32 г., да кожнай культустановы і асьветніка, арганізаваўшы збор рацыяналізатарскіх прапаноў па выкананьні колькасных паказьнікаў культпляну і палепшаньні якасьці работы, узьняўшы новую хвалю ўдарніцтва імя пастановы ЦК УсеКП(б) і XIV-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі, дабіўшыся ахопу індывідуальным і брыгадным ударніцтвам ня менш 50 проц., а сацспаборніцтвам 100 проц. асьветнікаў БССР.

8. Праз прымацаваньне да прадпрыемстваў культустаноў, арганізаваць удзел асьветнікаў у прапрацоўцы рабочымі прамфінпляну 4-га апошняга году пяцігодкі, высоўваньні сустрэчнага пляну і давядзеньні яго да цэху, агрэгату, рабочага. Арганізаваць удзел асьветнікаў у прапрацоўцы 2-й пяцігодкі.

9. Арганізаваць на прадпрыемствах пасты з асьветнікаў і вучняў старэйшых груп па аказаньні дапамогі рабочым у наладжваньні вучоту выкананьня прамфінпляну, сацспаборніцтва і ўдарніцтва, ліквідацыі абязьлічкі, поўнага пераводу прадпрыемства на гаспадарчы разьлік і г. д.

10. Узяць культшэфства (па лініі асьветнікаў і сэкцыі навуковых працаўнікоў) па арганізацыі гурткоў і іншых відаў барацьбы за аўладаньне тэхнікай на прадпрыемствах.

11. Культустановы арганізоўваюць практычную дапамогу раённым і сельскім арганізацыям у давядзеньні пляну асеньняй і веснавой пасеўкампаніі да калгасу і аднаасобнага двара, у правядзеньні загатовак, мабілізацыі сродкаў, па вучоту працы і арганізацыі зьдзельшчыны ў калгасах, па разгортваньні сацыялістычных мэтадаў у рабоце калгасаў, саўгасаў, МТС, ставячы сваёй задачай дабіцца замацаваньня існуючых калгасаў і перавыкананьня да канца 1931 г. намечанага плёну калектывізацыі па БССР. Наладзіць культабслугоўваньне калгасаў, саўгасаў і МТС.

12. У час правядзеньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі і саюзных органаў працасьветы вывучыць вопыт аднэй гарадзкоў і аднэй раённай сельскай арганізацыі па лепшым ажыцьцяўленьні дырэктыў партыі аб павароце прафарганізацый тварам да вытворчасьці, і арганізацыі ўдзелу асьветнікаў і культустаноў у правядзеньні асноўных гаспадарча-палітычных кампаній, для распаўсюджваньня гэтага вопыту на ўсе арганізацыі БССР.

13. Правесьці Ўсебеларускі збор прапаноў па далейшай перабудове прафработы да чарговага рэспубліканскага зьезду саюзу Працасьветы.

14. Устанавіць пераходны сьцяг Цэнтральнага Праўленьня для гарадзкой ці раённай арганізацыі, якая дабіецца лепшых колькасных і якасных паказьнікаў, у выкананьні культпляну 1931-32 навучальнага году і гэтага дагавору на аснове разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва як ўнутры сваёй арганізацыі, так і з раёнамі Заходняй вобласьці.

Арбітрам абіраюцца газэты «Савецкая Беларусь», «ЗКП» і «Рабочий Путь».

Гэтыя абавязацельствы павінны быць неадкладна даведзены да кожнай прафарганізацыі асьветнікаў, да кожнага асьветніцкага калектыву, да кожнага асьветніка.

Нізавыя прафарганізацыі асьветнікаў павінны ўзьняць асьветніцкія масы на выссўваньне сустрэчных« абавязацельстваў з тым, каб дырэктывы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б былі поўнасьцю і датэрмінова выкананы.

Н. Левін.

У ходзе сяўбы пералом яшчэ не дасягнуты

Плян выкананы ўсяго на 17 проц.

Пакончыць з апартуністычным благадушшам. На фронт сяўбы і зяблёва кінуць галоўныя сілы партыйных і савецкіх арганізацый, калгасаў, саўгасаў і МТС

Не дапусьціць скарачэньня плянаў асеньняй сяўбы

У гэтым годзе калгасы, саўгасы і аднаасобны сэктар Магілёўшчыны пасеялі засеяць пад азімы клін 26.630 га жыта і 900 га пшаніцы. Нягледзячы на гэтую вялікую лічбу, сяўба разгортваецца вельмі марудна.

Зусім дрэнна пастаўлена работа па засыпцы і ачыстцы насенных фондаў у калгасах. Калгасы «Чырвоны баец» і «1-га мая» не ачыцьцілі ніводнага фунта жыта. Ёсьць выпадкі, калі асобныя калгасы імкнуцца скараціць пасеўплошчу. Напрыклад, калгасы «VI зьезд саветаў» і «10-цігодзьдзя БССР», скарацілі пасеўныя пляны на 20 проц., спасылаючыся на тое, што няма зямлі і насеньня.

Трэба рашуча ўдарыць па апартуністых, якія арыбаюць пасеўныя пляны і пакласьці канец чарапашым тэмпам у разгортваньні сяўбы.

Ул. Марскі.

Калгас „1-га мая" высунуў сустрэчны плян пасеву

ТАЛОЧЫН. Калгас «1-га мая», Крупчанскага сельсавету да 1-га верасьня засеяў 70 га жыта. Паводле пляну трэба засеяць 82 га.

Калгаснікі, абгаварыўшы на агульным сходзе плян пасеву азімых, з свайго боку высунулі сустрэчны плян пасеву замест 82 га засеяць 108 га.

Прыклад калгасу «1-га мая» павінны падхапіць усе калгасы.

Ванцэвіч Ул.

Праводзячы сяўбу, не забываць пра ўборку

Калгас «Вольная Беларусь», Слуцкага раёну праводзячы асеньнюю сяўбу, зусім забыў пра скончэньне ўборкі ўраджаю. Уборка ўраджаю ў калгасе зацягваецца. 40 га аўсу яшчэ ня ўбрана. Калгас павінен зараз-жа рашуча ўзяцца за ліквідацыю прарываў па ўборцы ўраджаю, адначасова з тэтым разгарнуць і асеньнюю сяўбу з тым, каб у тэрмін выканаць і перавыканаць пасеўныя пляны.

Мазо.

Досыць спаць!

СТАРАСЕЛЬЛЕ. (Наш кар.). Асеньняя сяўба ў калгасах Старасельскага сельсавету зацягваецца. Рад калгасаў яшчэ зусім не распачынаў сяўбы. Калгас «Уперад» не падрыхтаваў нават паловы ворыва пад засеў. Насеньне для засеву азімага кліну яшчэ не абмалочана. Малатарні ня працуюць.

Талачынскі раён.

У. Арэшкаў.

Узор бальшавіцкай работы

Прыклад „Бальшавіка"—ва ўсе калгасы

Калгас «Бальшавік», Чырвонадворскага сельсавету, першым у Старобінскім раёне распачаў асеньнюю сяўбу і за першыя 10 дзён засеяў 123 га жыта і пшаніцы.

Зараз калгас «Бальшавік» рыхтуецца да ўборкі бульбы.

Для дапамогі саўгасу Калацэвічы ва ўборцы сенажаці вылучыў брыгаду з 40 калгаснікаў.

Г. ЛІСТАПАД.

Бабруйск цягнецца ў хвасьце

БАБРУЙСК. 9-IX (Белта) Тэмпы асеньняй сяўбы па Бабруйскім раёне зусім нездавальняючыя. Плянавае заданьне да 5-га верасьня выканана на 30,5 проц. Узьняце зябу—найбольш адсталы вучастак. Узорана пад зяб у калгасах—5,3 проц., у аднаасобным сэктары—3,5 проц. пляну. Палова насеньня ў раёне яшчэ не ачышчана.

Раённыя арганізацыі—райза і райкалгасаюз не забясьпечылі сапраўднага апэрацыйнага кіраўніцтва сяўбой.

Прэмію за лепшае правядзеньне сяўбы

Магілеў (Белта). Райпрафсавет, рэдакцыя «Камунар Магілеўшчыны» і райза абвясьцілі конкурс на лепшае правядзеньне сяўбы, зяблевага ворыва, уборкі, абмалоту ,расьцілу і апрацоўкі лёну і загатоўчай кампаніі паміж калгасамі, сельсаветамі і вёскамі. Кошт прэмій складае 11.000 руб.

Угнаеньне ляжыць на станцыі

Асеньняя сяўба ў Тураўскім раёне праходзіць вельмі марудна. Па радзе калгасаў, як «Чырвоны Пуцілавец», «Новае жыцьцё» і інш. плян асеньняй сяўбы не даведзены да калгаснікаў. Па некаторых калгасах да гэтага часу не адрамантаваны інвэнтар і ня створаны неабходныя насенныя фонды.

З боку райкалгасаюзу ня былі прыняты меры, каб паскорыць малацьбу і рамонт інвэнтара. Для калгасаў раёну прыбыло тры вагоны ўгнаеньня якое да гэтага часу ляжыць на станцыі.

Брыгада друку: **Протчанка, Сухоцкі, Раманчык.**

Раўняцца па „Чырвоным Партызане"

Магілёў (Белта). Калгас «Чырвоны Партызан» Добрасьневіцкага сельсавету, да 1-га верасьня першым ў раёне скончыў сяўбу азімых з перавыкананьнем пляну на 2 га. Таксама поўнасьцю скончыў ўборку, абмалот і расьцілі лёну.

ЗВОДКА

аб ходзе ўборкі лёну і першапачатковай апрацоўкі, ўборкі яравых зярнёвых і пасеў азімых па БССР (без саўгасаў) на 5-га верасьня 1931 г.

Назва раёнаў	Уборка лёну ў проц.	Абмалочана да выцераб. у проц.	Проц. замоч. і разосл. да выцераб.	Уборка яравых зернав. у га	Сяўба азіміны ў га
				Проц. вык.	Проц. вык.
Брагінскі	100	49,0	49,0	100	2,3
Буда-Кашалёўскі	100	75,7	75,7	96,9	1,4
Бабруйскі	85,5	75,8	75,8	92,6	30,9
Веткаўскі	100	16,8	16,8	85,6	—
Глускі	78,6	49,7	49,7	74,8	—
Гомельскі	67,0	65,8	65,8	72,0	2,2
Жыткавіцкі	90,4	13,4	13,4	46,9	—
Жлобінскі	100	57,7	57,7	83,2	0,2
Кармянскі	100	62,4	58,6	84,0	45,5
Кама нынскі	100	21,1	—	49,6	15,7
Ельскі	100	100	100	84,2	6,2
Лоеўскі	100	—	—	62,4	5,4
Любаньскі	100	76,1	72,3	96,6	0,2
Лельчыцкі	100	58,0	58,0	70,8	—
Мазырскі	99,7	—	—	80,0	3,8
Нараўлянскі	100	8,9	—	74,4	0,8
Парыцкі	90,9	85,1	85,1	100	45,4
Петрыкоўскі	99,8	—	—	62,9	0,8
Рагачэўскі	100	93,7	91,4	93,8	15,2
Рэчыцкі	100	65,0	48,7	89,9	—
Слуцкі	100	51,8	42,6	85,1	2,9
Старобінскі	100	75,0	75,0	89,1	4,8
Старадароскі	80,4	26,5	22,5	60,5	—
Тураўскі	82,1	19,3	18,9	56,7	0,6
Церахаўскі	100	74,1	69,5	95,0	14.0
Чачэрскі	100	100	100	69,9	36.5
Чырвона-Польскі	100	65,1	65,1	94,4	20,3
Чырвона-Слабодз.	87,4	63,7	61,7	61,2	12,3
Уваравіцкі	100	39,5	39,3	79,6	1,2
Хойніцкі	100	50,3	50,3	71,5	5,3
Па Паўднёвай зоне	99,1	54,9	52,2	82,1	10,0
Асіпавіцкі	93,7	40,8	35,8	89,5	4,5
Быхаўскі	57,6	5,6	5,6	83,3	0,2
Барысаўскі	82,4	12,3	12,3	33,7	19,4
Бялыніцкі	98,6	—	—	89,5	26,5
Бягомльскі	38,6	—	—	51,8	19,8
Бярэзінскі	100	78,8	20,8	87,4	19,1
Горацкі	81,1	16,8	12,4	88,1	12,3
Заслаўскі	86,3	27,5	23,3	81,1	14,2
Клімавіцкі	100	44,1	26,3	100	26,0
Крупскі	96,4	83,2	83,2	91,8	31,7
Копыльскі	58,6	52.4	28,5	90,3	2,2
Касьцюковіцкі	76,4	100	100	51,0	2,7
Клічаўскі	100	60,7	60,7	81.2	17,6
Койданаўскі	87,9	18.4	4,5	71,5	10,5
Крычаўскі	100	60,8	54,6	91,2	22,0
Лагойскі	94,7	63,8	58,9	91,0	46,3
Магілеўскі	92,8	—	—	76,8	11,8
Мсьціслаўскі	87,8	23,3	17,7	54,9	23,7
Менскі	100	1,1	—	54,4	6,1
Прапойскі	97,0	52,7	27,5	71,4	—
Пухавіцкі	94,0	82,9	61,0	90,5	2,0
Плешчаніцкі	49,8	21,3	18,1	41,3	12,7
Смалявіцкі	99,6	72,3	65,1	94,2	24,3
Талочынскі	92,3	25,9	25,9	73,2	34,9
Чэрвеньскі	99,2	69,3	64,6	71,2	31,1
Чавускі	98,2	76,7	69,1	85,5	18,6
Чэрыкаўскі	93,1	65,4	62,7	80,5	13,6
Шклоўскі	99,7	55,4	3,1	76,6	25,5
Узьдзенскі	99,6	58,7	36,5	87,4	6,6
Па цэнтральнай	84,2	46,6	35,4	74,9	16,4
Асьвейскі	96,1	87	87	27,2	18,4
Аршанскі	79,0	46,9	46,9	58,6	43,1
Бешанковіцкі	82,4	68.9	38,6	88,3	11,6
Віцебскі	93,7	67,6	67,6	84,2	31,0
Вушацкі	95,8	—	—	90,1	46,6
Гарадокскі	99,3	81,0	77,7	79,2	82,4
Дубровенскі	78,0	30,1	7,7	81,2	15,6
Дрысенскі	74,2	55,9	55,9	33,5	22,0
Лёзьненскі	99,8	82,5	77,7	76,0	68,4
Лепельскі	99,2	42,7	41,5	69,1	37,4
Полацкі	75,0	78,1	78,1	48,4	21,6
Расонскі	88,2	70,8	44,1	51,3	0,9
Сураскі	96,3	62,0	62,0	100	70,9
Сененскі	100	49,3	40,3	88,2	16,3
Сіроцінскі	92,9	66,9	66,9	68,4	49,7
Чашніцкі	60,7	35,5	35,5	48,7	9,6
Па паўночнай	89,4	60,9	55,0	68,8	36,3
Па БССР	89,5	54,4	47,4	70,6	18,2

Увага: Раёны—Дубровенскі, Быхаўскі, Буда-Кашалёўскі, Веткаўскі, Жлобінскі, Капыльскі, Прапойскі, Стара-Дароскі, Брагінскі, Глускі, Лоеўскі, Мазырскі, Петрыкаўскі, Рэчыцкі і Гомельскі не прадставілі зьвестак на 5-га верасьня і да дзеньня па гэтых раёнах уключаны з папярэдняй пяцідзёнкі.

Сельсаветы—тварам да калектывізацыі

Баявое аператыўнае кіраўніцтва калгасным рухам—

АСНОУНАЯ ЗАДАЧА СЕЛЬСАВЕТАЎ

У часе асеньняй сяўбы сельсаветы павінны яшчэ больш узьняць хвалю калгаснага прыліву, арганізацыйна замацаваць і аформіць існуючыя калгасы, даць ім больш жывога канкрэтнага кіраўніцтва. Сельска-гаспадарчыя вытворчыя нарады пры сельсаветах павінны заняць пачэснае месца ў барацьбе за гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў

Ачысьціць калгасы Юзафоўскага сельсавету ад кулацтва

Пытаньне ачысткі калгасаў ад кулацкіх элемэнтаў калгаснікі, беднота і сераднякі Юзафоўскага сельсавету Дрысенскага раёну ўзьнімалі некалькі разоў, але безрэзультатна. Калгасы, якія знаходзяцца на тэрыторыі сельсавету яшчэ і зараз засьмечаны кулакамі і іншымі варожымі элемэнтамі, якія зрываюць работу ў гэтых калгасах.

У калгасе імя Сталіна ёсьць, напрыклад, былы жандар Сьвіршчэўскі, які працуе там у якасьці рахункавода. У 1929 годзе Сьвіршчэўскі быў абкладзены ў індывідуальным парадку.

Ёсьць кулакі і ў іншых калгасах, але Юзафоўскі сельсавет і праўленьне калгасу ня прымаюць ніякіх мер да ачысткі калгасаў ад кулацтва.

Піла.

„Перабудова работы саветаў—ня наша справа"

Пастанова ўраду аб перабудове работы саветаў, як відаць, яшчэ не дайшла да Пухавіцкага раёну. Сэкцыі ў большасьці сельсаветаў зусім не працуюць.

Некаторыя сельсаветы лічаць, што перабудова работы—гэта ня іх справа. Напрыклад, старшыня Дрычынскага сельсавету кажа: — «Няхай прыяжджае інструктар РВК, ды і перабудоўвае, а гэта ня наша справа».

Дрычынскі сельсавет адстае ў выкананьні важнейшых гаспадарча-палітычных задач і гэта тлумачыцца тым, што ўся работа сельсавету выконваецца толькі старшынёй і сакратаром. Работа чая і калгасная грамадзкасьць у работу сельсавету зусім ня ўцягнута.

Рудзенскі сельсавет, аб прарывах у рабоце якога ўжо сыгналізавала «Савецкая Беларусь» — усё-ж такі не пачуў сыгналаў друку і не перабудаваў сваю работу.

У выніку таго, што сельсаветы яшчэ не перабудавалі сваёй работы і не ўцягнулі ў яе прамадзкасьць, па раёне ёсьць шмат прарываў у правядзеньні важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній.

Пухавіцкі РВК зусім ня кіруе перабудовай работы сельсаветаў.

Работа сельсаветаў Пухавіцкага раёну патрабуе рашучай перабудовы.

Г. Фрыд.

Крупскі месцсавет павінен узначаліць калгасны рух

У Крупскім месцсавеце Крупскага раёну за апошні час наглядаецца ўзмацненьне цягі беднаты і сераднякоў у калгасы. Аднак, месцсавет ня стаў на чале гэтага руху, ня кіруе ім. З цэлага раду вёсак (Бярозаўка, Дубашня, Нов. Крупка і інш.) у месцсавет некалькі разоў паступалі просьбы беднаты і сераднякоў аб арганізацыі там калгасаў.

Гэтыя просьбы застаюцца нявыкананымі. Справа ў тым, што масавая работа ў Крупскім месцсавеце зусім не разгорнута. Уся работа месцсавету ў асноўным праводзіцца старшынёй і сакратаром пры ўдзеле чалавек трох актыву. Сэкцыі пры месцсавеце не працуюць.

Вядомая рэч такі месцсавет ня здольны сапраўды стаць на чале калгаснага руху, ня можа справіцца з гэтай работай. Нават і арганізаванымі ўжо калгасамі месцсавет мала цікавіцца і ня імкнецца замацаваць іх. Так у вёсках Н. Крупка і Рамановічы калгасы арганізаваны, але да іх замацаваньня месцсавет ніякіх мер ня прымае. Гэтыя калгасы нават ня ведаюць, дзе і як сёлета сеяць азімыну.

На тэрыторыі Крупскага месцсавету ёсьць тры партыйныя ячэйкі, ячэйка ЛКСМБ, ёсьць прафэсыянальныя і грамадзкія арганізацыі, але ніхто з іх не дапамагае месцковаму савету ў рабоце і нічога ня робіць для пашырэньня калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Мала дапамагае месцсавету і Крупскі РВК.

Па выкананьні плянаў розных гаспадарча-палітычных кампаній у месцсавеце ёсьць таксама рад прарываў, напрыклад, па загатоўках. На кулацкі месцсавет недастаткова націскае. У выніку чаго кулацкімі гаспадаркамі слаба выконваюцца цьвёрдыя заданьні па загатоўках.

Работа Крупскага месцсавету павінна быць зараз жа перабудавана і ўзмоцнена. Партыйныя, прафэсыянальныя і грамадзкія арганізацыі, якія знаходзяцца на тэрыторыі месцсавету павінны дапамагчы месцсавету ў перабудове яго работы.

Ударнік.

Бабчынскі сельсавет павінен перабудаваць сваю работу

Бабчынскі сельсавет Хойніцкага раёну яшчэ не перабудаваў сваёй работы па новаму. Сельсавет ня кіруе калектывізацыяй, ён нават ня ведае наколькі проц. калектывізаваны вёскі.

Хлебазагатоўкі па сельсавеце праводзяцца дрэнна. Сельсавет да гэтага часу ня даў цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам і не давёў кантрольных лічбаў да кожнай гаспадаркі.

Лічбы загатоўкі бульбы скорасьпейкі хоць і былі даведзены да вёсак, але-ж яны ня выконваюцца. Сельсавет не наладзіў кантроль за выкананьнем пляну загатовак.

Рэалізацыя пазыкі «3-га рашаючага году пяцігодкі» па сельсавеце праходзіць нездавальняюча. Кантрольная лічба далёка невыканана. Мабілізацыя сродкаў праз ашчаджасу зусім не праводзіцца. Штрафы, якія даюцца сельсаветам, не спаганяюцца.

Члены сельсавету не прыцягнуты да правядзеньня гаспадарча-палітычных кампаній. Да тых членаў сельсавету, якія ня выконваюць сваіх абавязкаў, сельсаветы ня прымаюць ніякіх мер узьдзейнічаньня.

Партячэйкі, якіх ёсьць на тэрыторыі сельсавету дзяве сельсавету не дапамагаюць, ня кіруюць яго работай.

Бабчынскаму сельсавету трэба безадкладна перабудаваць сваю работу, з тым, каб гаспадарча-палітычная кампанія праходзіла пасьпяхова і мела належны эфэкт.

Партыйныя ячэйкі павінны дапамагчы сельсавету перабудаваць работу штодня практычна дапамагаць яму ва ўсёй у рабоце.

Брыгада «Сав. Бел.»
Падарожны, Лясны і Фіалка.

Работу прызыўных пунктаў—

у цэнтр увагі пралетарскай грамадзкасьці

Новае папаўненьне ідзе ў рады Чырвонай арміі

Жыцьцёвы і баявы шлях сталёвага бальшавіка, Наркамваенмору, таго, хто сумесна з тав. К. Е. Варашыловым, паклаў палатак стварэньню сучаснай Чырвонай арміі,—вось што сустракае перш за ўсё ўсякага хто ўходзе ў клюб харчавікоў, зараз—прызыўны пункт Менску.

Лінія фота-здымкаў вандроўнай выстаўкі «М. Ф. Фрунзэ» працягнулася на ўсёй сьцяне пры ўваходзе. Яна стварае адпаведнае ўражаньне, дае адпаведны настрой.

У памяшканьні пункту мала народу, няма цесноты, няма чаргі.

У калідоры за чорнай заслонай—5-6 чалавек распранаюцца, рыхтуюцца да агляду камісіі.

Астатнія прызыўнікі—частка слухаюць канцэрт, частка лекцыі... Некалькі асоб ля прыёмнага стала, некалькі ля стала настаўніка, які правярае пісьменнасьць.

У бягучым годзе на прызыў зьяўляюцца па прадпрыемствах у арганізаваным парадку. Другі дзень ідзе прызыў. Ідуць прызыўнікі «Бальшавіка», «Дрэваапрацоўчыка», «Пралетара», «Ударніка». Яны ідуць ў вызначаны час і дзень. Прыходзяць калёнамі, з аркестрамі, з лёзунгамі. Яўка пакуль—100 проц.

На пункце спакойна. Твары прызыўнікоў сур'ёзныя: яны прыйшлі не на гульню. Яны прыйшлі, каб уступіць у рады слаўнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі, на варту будаўніцтва сацыялізму.

Толькі ў прыёмным пакоі, калі старшыня прызыўнай камісіі тав. Майзэль кажа: «Вітаю вас, таварыш. Вы прыняты»,—толькі тады шырокая ўсьмешка асьвятляе твар прызыўніка. Вясёлым выходзіць прыняты і сумным той, які па здароўі прызнаны ня годным...

Вялікі ўздым адчуваецца, калі пагутарыш з прызыўнікамі. Гэты ўздым будзе працягвацца і ўвесь час вайсковай службы, ператварыўшыся ва ўдарніцтва ў вайсковай вучобе...

Новае моцнае папаўненьне ідзе ў рады нашай слаўнай Чырвонай арміі.

М. Тараруй.

Што прапушчана ў час падрыхтоўкі—дарабіць у час прызыву

Слуцк. (Наш кар). Як партыйныя таксама і грамадзкія арганізацыі Слуцкага раёну пытаньню падрыхтоўкі да прызыву ўвагі не аддаюць. Райпрафсавет зусім гэтай справай ня цікавіцца.

Камісіі садзейнічаньня, якія створаны пры кожным сельсавеце, нічога ня робяць. Камісіі паасобных сельсаветаў у рабоце па клясавым адборы даходзяць да перагібаў, якія потым прыходзяцца спраўляць.

Што-ж да складзеньня сельсаветамі характарыстык на прызыўнікаў,—дык тут справа абстаіць зусім дрэнна. Мусіцкі, Шымчыцкі, Палікарпаўскі і Грэскі сельсаветы як-бы наўмысьля, ўпарта не жадаюць прадстаўляць характарыстыкі. РВК вымушаны перадаваць справу аб гэтым пракурору для прыцягненьня вінаватых для адказнасьці.

Сапраўдная работа па растлумачэньні значэньня прызыву і службы ў Чырвонай арміі сярод прызыўнікаў адсутнічае. Канфэрэнцыя прызыўнікаў па сельсаветах ня ўсюды праводзіцца. Што-ж да вясковых сходаў прызыўнікаў, дык аб гэтым і гаварыць ня прыходзіцца.

Тут неабходна падкрэсьліць адсутнасьць удзелу ў рабоце па прызыву, як райкому ЛКСМБ, так і вясковых ячэек камсамолу, якія павінны былі ў гэтай справе прымаць самы актыўны ўдзел і зрабіць падрыхтоўку да прызыву баявой.

У адносінах ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод прызыўнікаў таксама прыходзіцца аднаначыць самацёчнасьць і няпоўны ахоп лікпунктамі няпісьменных. Настаўніцтва, ня гледзячы на канкрэтныя абавязкі, якія яно на сябе ўзяло на канфэрэнцыі па гэтай справе,—работу па ліквідацыі няпісьменнасьці прызыўнікаў вядзе нядбайна. Сапраўднага выяўленьня і вучоту няпісьменных у раёне няма.

У гэтым напрамку некаторую работу правёў райсавет Асоавіяхіму, які склаў 9 брыгад у ліку 45 асоб для работы па раёне. Гэтыя брыгады па некаторых сельсаветах выявілі няпісьменных і наладзілі работу некаторых лікпунктаў.

Адзначаючы паданыя факты, якія красамоўна сьведчаць аб прарывах у падрыхтоўцы да прызыву,—праба сказаць, што работа ў гэтай справе павінна быць зараз-жа наладжана. Трэба памятаваць, што работа з прызыўнікамі павінна праводзіцца ня толькі да прызыву, але і ў час прызыву да самага дню прыёма прызыўніка ў рады РСЧА.

Райком партыі павінен павярнуцца тварам да прызыўной кампаніі і дабіцца ад нізавых партарганізацый сапраўдных ударных тэмпаў у гэтай вялізарнай палітычнай кампаніі.

Што прапушчана ў час падрыхтоўкі—павінна быць дароблена ў час прызыву.

Ал. Курдо.

Наладзіць работу

Па Абчугскім сельсавеце Крупскага раёну падрыхтоўка да прызыву на справе зусім не вядзецца. Прызыўнікі толькі атрымалі позвы і на гэтым ўся «падрыхтоўка» да прызыву амаль скончылася.

Падрыхтовачнай работай не цікавяцца ні сельсавет, ні партячэйка, ні, відавочна, і РВК. Сходаў прызыўнікаў сельсавет ня рабіў, хаця гэта было магчыма зрабіць.

Яшчэ добра, калі прызыўнік пісьменны: ён будзе разумець усе тыя задачы, якая стаяць перад кожным чырвонаармейцам; гэта ён можа даведацца праз газэты.

Але па Абчугскаму сельсавету ёсьць шмат няпісьменных і малапісьменных прызыўнікаў і з імі ніякай работы ў сучасны момант па ліквідацыі няпісьменнасьці ніякай не вядзецца.

Прызыўнік Цвырко Я.

У адказ на фашысцкі тэрор

У адзнаку пратэсту супроць зьдзекаў польскага фашызму над працоўным насельніцтвам Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, я, прызыўнік 1909 году—Цвырко Якуб, унашу 1 рубель у фонд дапамогі палітзьняволеным і абяцаю ў час службы ў радох РСЧА быць сапраўдным вартаўніком межаў СССР.

Я выклікаю пасьледаваць майму прыкладу ўсіх прызыўніноў Крупскага раёну.

Прызыўнік Цвырко Я.

На Прэзыдыуме БАН

9 верасьня Прэзыдыум Акадэміі разгледзеў цэлы рад надзвычайна важных пытаньняў. Быў заслухан дкалад прафэсара Прылежаева аб становішчы і пэрспэктывах працы Інстытуту хіміі БАН, разгледжаны прапановы Інстытуту біалёгічных навук адносна Усесаюзнага батанічнага зьезду, які ў канцы верасьня г. г. адбудзецца ў Ташкенце і аб удзеле дэлегацыі ў гэтым зьезьдзе ад БССР, зацьверджаны плян працы Прэзыдыуму БАН да канца 1931 г.

Даклад Хімінстытуту выклікаў цэлы рад выступленьняў. У гэтых апошніх было падкрэсьлена, што да гэтага часу Інстытут хіміі ні па сваёй тэматыцы, ні па навуковай прадукцыі, ні па складу навуковых працаўнікоў ні ў якай меры не адпавядае тым задачам, якія прад

Кожны райфа, гарсавет, сельсавет, мясцоком саюзу ФБР
Кожная партыйная і комсамольская ячэйка
Кожная ашчадкаса
Кожны рабелькор
Кожны актывіст

павінны змагацца за пяршынства ва ўсебеларускім конкурсе

Новымі формамі і мэтадамі работы, сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам даб'емся 100-процантнага выкананьня фінпляну

Умова ўсебеларускага конкурсу ка лепшае выкананьне фінпляну III рашаючага кварталу

Ус'м загадчыкам гарфа і райфа і РМК саюзу фінбанкаўскіх работнікаў

Наркамфін БССР сумесна з ЦП Саюзу фінбанкаўскіх работнікаў арганізуе Ўсебеларускі конкурс на лепшае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў 3-га кварталу. Для правядзеньня конкурсу складзена камісія з прадстаўнікоў—члена Калегіі НКФ БССР, члена Прэзыдыуму ЦП Саюзу фінбанкаўскіх работнікаў, прадстаўнікоў газэт: «Зьвязда», «Рабочий», «Савецкая Беларусь» і «Калгасьнік Беларусі».

Для правядзеньня конкурсу ў распараджэньне конкурснай камісіі асигнаваны фонд прэміяваньня.

Зацьверджаны асноўныя аб'екты і паказальнікі конкурсу наступныя:

1. Лепшая арганізацыя масавай работы па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў. Агітацыйна-растлумачальная работа сярод насельніцтва па папуляризацыі правадзімых фінансавых мерапрыемстваў; сыстэматычнасьць гэтай работы і ўвязка яе з правадзімымі іншымі палітычна-гаспадарчымі кампаніямі. Работа фінансавага актыву, сельскіх камісій садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе, камсодаў пры калгасах; прадпрыемствах; работа калгасьнікаў сярод аднаасобнікаў, як застрэльшчыкаў і арганізатараў правадзімых фінансавых мерапрыемстваў; работа сельскіх брыгад, камсамолу, асобных актывістаў (настаўнікаў, агранамаў, хатнікаў, дактароў і г. д.). Становішча сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Арганізацыя грамадзкага буксіра; дапамога адстаючым сельсаветам, калгасам, ашчадкасам і інш. арганізацыям. Іншыя формы ўдзелу грамадзкасьці ў справе мабілізацыі сродкаў (асабліва адзначаюцца новыя формы).

2. Лепшыя вынікі выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў. Выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў за III квартал па асобных плацяжох (прыводзяцца лічбы заданьня і выкананьня).

а) Па абавязковых плацяжох. Ці добра праведзена агітацыйна-растлумачальная работа; эфэктыўнасьць растлумачальнай работы (колькасьць бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якія ступілі ў калгасы з 1-га чэрвеня да 1га жніўня ў абсалютных лічбах і ў процантах да агульнага ліку аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак; процант калектывізацыі на першае кастрычніка 1931 г.). Тэрмін уручэньня акладных лістоў; пасьляховасьць паступленьня сельска-гападарчага падатку і страхоўкі; якая работа праведзена за датэрміновае паступленьне гэтых плацяжоў аднаасобнымі гаспадаркамі, калгасьнікамі, калгасамі. Наколькі сваячасова і поўна спагнаны плацяжы з кулацкіх гаспадарак.

в) Па пазыцы. Ступень ахопу пазыкай «3-ці рашаючы» рабочых, служачых, прыватнасьці сэзоньнікаў, калгасьнікаў, неарганізаванага насельніцтва (гарадзкога), сялян аднаасобнікаў (у абсалютных лічбах і ў процантных адносінах па кожнай групе). Які процант складае падпіска да месячнага фонду заработнае платы рабочых, служачых; сума рэалізаванай пазыкі сярод сэзоньнікаў, калгасьнікаў, сялян-аднаасобнікаў. Сваячасовасьць і паўнота афармленьня падпіскі ўзносамі. Сваячасовасьць унясеньня паступовых узносаў. Наколькі добра і сыстэматычна абслугоўваюцца падпісчыкі і пазыкатрымальнікі.

г) Па ашчадсправе. Выкананьне пляну разгортваньня сеткі ашчадкас; колькасьць укладчыкаў і сумы ўкладаў на 1 студзеня і 1 кастрычніка 1931 г. (з выдзяленьнем ліку ўкладчыкаў і сумы ўкладаў сялян); сярэдні разьмер укладаў на душу гарадзкога і асобна вясковага насельніцтва; як пастаўлена абслугоўваньне насельніцтва.

д) Па звароту сельска-гаспадарчых пазык. Прынятыя меры да спагнаньня пратэрмінаваных пазык і сума пратэрмінаванай запазычанасьці па паасобных сэктарох на 1-X 31 г. (за калгасамі, аднаасобнікамі).

е) Па паянакапленьні. Работа каапэратыву, сельспажыўтаварыства, проц. каапэраваньня паасобных груп насельніцтва (рабочых і служачых, калгасьнікаў, сялян); ступень каапэраваньня іншых членаў сям'і. Сума запазычанасьці па паёх на 1-X 31 г. па паасобных групах. Хуткасьць прасоўваньня тавараў да спажыўца.

ж) Па акцыях Трактарацэнтру і аба вязацельствах на сельска-гаспадарчыя машыны. Якая праведзена работа па рэалізацыі акцый і абавязацельстваў, як удзельнічаюць у гэтай рабоце зямельна-калгасныя органы і сума рэалізацыі па паасобных сэктарох (сярод калгасаў, асобна сярод аднаасобнікаў).

з) Па самаабкладаньні. Як праведзена растлумачальная работа. Калі дасланы дырэктывы і плян сельсаветам. Калі пачата работа па правядзеньні сходаў і калі скончана. Ці поўнасьцю ахоплены самаабкладаньнем насельніцтва. Сярэдні процант прынятага самаабкладаньня да сельска-гаспадарчага падатку, сваячасовасьць сканчэньня раскладкі і ўручэньня паведамленьняў платнікам; пасьляховасьць паступленьня сум і правадзімая ў гэтым напрамку работа.

Прэміравацца будуць лепшыя райфа, райбанкі, сельсаветы, ашчадкасы, паасобныя брыгады, раённыя газэты, паасобныя працаўнікі апарату і актывісты.

РМК Саюзу і кіраўніком фінбанкаўскіх устаноў прапануецца зараз-жа разгарнуць шырокую масавую работу па папулярызацыі конкурсу і мабілізацыі грамадзкасьці на лепшае і 100 проц. выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў III кварталу. Шляхам пастаноўкі пытаньня перад раённымі арганізацыямі (партыйнымі, савецкімі, камсамольскімі, прафсаюзнымі, калгаснымі і інш.), увязаўшы работу з мясцовым друкам, разгарнуць сапраўды масавую работу вакол гэтага пытаньня.

Час да сканчэньня III кварталу застаўся вельмі кароткі. Неабходна заразка разгарнуць работу з тым, каб за гэты кароткі тэрмін дабіцца становішча вынікаў конкурсу і мабілізаваць на гэта ўсю раённую грамадзкасьць.

Абавязваем усіх кіраўнікоў фінбанкаўскіх устаноў і РМК сыстэматычна, пасьля кожнай пяцідзёнкі, пачынаючы з 15 верасьня да сканчэньня III кварталу, інфармаваць аб ходзе конкурсу і пасьля сканчэньня III кварталу, не пазьней 10 кастрычніка, дасылаць поўны матар'ял у конкурсную камісію на асоб і арганізацыі, якія падлягаюць прэміраваньню па вашым раёне. Да дасылаемых матар'ялаў павінны быць далучаны пастановы мясцовых кіруючых арганізацый.

Вынікі конкурсу будуць абвешчаны 25 кастрычніка.

Час. в. аб. Народнага Камісара Фінансаў БССР Абрамсон.
Старшыня ЦП Саюзу ФБР Пархоменка.

Клімаўшчына здае тэмпы

Клімавічы (наш кар.) Клімавіцкі раён, які ішоў адным з першых у справе мабілізацыі сродкаў і атрымаў прэмію за пасьляховую рэалізацыю пазыкі «3-ці рашаючы», за апошні час пачаў значна здаваць ударныя бальшавіцкія тэмпы. Калі плян мабілізацыі сродкаў асобнага кварталу быў выкананы на 78,8 проц., дык першы квартал 1931 г. даў зьніжэньне да 70,2 проц., выкананьне пляну II кварталу дае ўжо толькі 58,2 проц., а III квартал, па становішчы на 1 верасьня сыгналізуе аб пагрозе зрыву пляну мабілізацыі сродкаў (38 проц.). Заданьне па сельгаспадатку выканана на 20,4 проц., па страхоўцы на 15 проц. Самаабкладаньне праведзена толькі па 3-х сельсаветах (Гусарскі, Арлоўскі, Асмалоўскі). Пратэрмінаваныя пазычкі не спагняюцца. Афармленьне падпіскі на пазыку «3-ці рашаючы» злачынна зацягваецца. Кулацка-заможным гаспадаркам цьвёрдыя заданьні поўнасьцю не дадзены. Продаж за гатоўку аблігацый па аднаасобным сэктары амаль спынёўся. Да гэтага часу яшчэ не ліквідавана запазычанасьць па падпісцы на пазыку «5-цігодка ў 4 гады». Рэалізацыя абавязацельстваў на сельгасмашыны і акцыі Трактарацэнтру ў большасьці сельсаветаў зусім сарвана. Работы па ўцягненьні вольных грашовых сродкаў у касы ашчаднасьці няма, у выніку чаго замест намечанага па пляну трыміву ў II-м квартале маецца значны адліў фізычных укладаў. Па паянакапленьні поўны зрыў пляну (2,4 проц.).

Чым тлумачыцца такое агідное становішча?

За апошні час, пад уплывам значных посьпехаў, пасьля ўдарнай рэалізацыі пазыкі «3-ці рашаючы», калі сапраўды была ўзьнята вялікая актыўнасьць усёй грамадзкасьці, даўшая поўны палітычны эфэкт, што ў свой час адзначала «Савецкая Беларусь», Клімавіцкія кіраўнікі фінансавага апарату... супакоіліся. Загадчык райфінчасткі т. Шакурын паехаў адпачываць на Каўказ заставіўшы замест сябе дырэктара райбанку т. Бузаву, але і ёй таксама захацелася «вольнага сьвежага паветра» і ўсьлед за Шакурыным Бузава ідзе ў «чарговы» месячны адпачынак, пакідаючы сваім намесьнікам т. Фёдарава. Але апошні, часта хварэючы, езьдзіў лячыцца ў Мекс і Воршу і фактычна справай мабілізацыі сродкаў амаль не займаўся.

Такім чынам гэты важнейшы вучастак работы быў абязьлічан амаль на працягу месяца і ў апараце, у зьвязку з адсутнасьцю «начальства», панаваў самацёк.

Бюро РК, якое, дарэчы кажучы, таксама на працягу месяца паслабіла ўвагу да гэтай справы, зараз ударыла па самацёчных настроях і дзеяньнях, абязсьцёўшы месячнік ліквідацыі прарыву, мабілізавала сілы з тым, каб да 1 кастрычніка забясьпечыць 100-процантнае выкананьне фінпляну III-га кварталу.

В. Бальзоўскі.

Мацней біць па дэзэртырах і лятунох

Стварыць належныя ўмовы для добрасумленных працаўнікоў

Задачы, якія стаяць зараз перад фінансавым апаратам, патрабуюць вялікай увагі па ўзмацненьні фінансавай сыстэмы наогул і асабліва правільнай расстаноўкі сіл раённага фінапарату. Радам пастаноў кіруючых органаў дадзены цьвёрдыя паказаньні аб тым, каб фінработнікаў на іншай рабоце не затрымліваць і безадкладна накіроўваць іх для работы ў фінапарат. Але недаацэнка гэтай справы пераважнай часткай раёнаў, дызэртырства і лятунства паасобных фінработнікаў значна перашкаджаюць узмацненьню і наладжваньню работы раённага фінапарату. Маюцца выпадкі, калі РВК замест пасылкі фінработнікаў у фінапарат, забіраюць іх на іншую работу. Напрыклад, Сеньненскі РВК забраў з свайго райфа інспэктара і скарыстоўвае яго па тэхнічнай рабоце ў сакратарыяце і ў той жа час дае патрабаваньне сэктару кадраў НКФ аб высылцы ў Сяно фінработнікаў. Лепельскі РВК забраў на тэхнічную работу кантралёра Лепельскай райашчадкасы, у той час як сама ашчадкаса не ўкамплектавана. Частка фінработнікаў ліквідаваных раёнаў ператварылася ў лятуноў і дызэртыраў: інспэктар б. Высачанскага раёну Танхельсон замест Сіроціна апынуўся ў Віцебску, бюджэтны інспэктар Андрэяў, з Журавін, у Прапойск ніяк ня выбярэцца. Марозаў з Вульскага раёну ў Горацкі райфа не зьяўляецца. Лясьнікоў, інспэктар па даходах, накіраваны ў Крычаў зьбег невядома куды. Жарнасек, Бурбо, Варанько, Сяргейчык, Бабкоў, Мітрафанаў таксама не зьяўляюцца на фінансавую работу ў паказаныя ім раёны. Казакевіч, інспэктар Дрысенскага райфа, пашоў у адпачынак 25 мая і да жніўня на работу не зьяўляўся, а зараз падаў заяву, каб яго зволілі.

Разам з гэтым у некаторых раёнах мала клапоцяцца аб стварэньні належных умоў для работы ўноў прыбываючым таварышом. Тав. Чабатараў, прыбыўшы на пасаду бухгальтара ў Рэчыцкі райфа, ніяк не атрымае кватэры, РВК яму не дапамагае. Чарняўскі, прыбыўшы ў Полацкі райфа таксама прымушаны спаць на сталах у райфінчастцы, бо яму РВК адмовіўся дапамагчы ў падшукваньні кватэры.

З лятунамі і дэзэртырамі трэба павесьці рашучую барацьбу. Партыйныя, прафэсіянальныя органы, а таксама органы працы і пракуратуры як цэнтральныя, так і мясцовыя павінны дапамагчы фінапарату ў гэтай справе.

Адначасова з гэтым трэба прыкласьці максімум энэргіі, каб стварыць лепшыя ўмовы работы для тых таварышоў, хто жадае працаваць сумленна і аддана.

М. Т. і Л.

Зводка выкананьня сэзоннага пляну торфаздабычы па торфазаводах БССР на 6 верасьня 1931 г.

Назва заводаў	Проц. выкананьня сэзоннага пляну
„Чырвоны Тарфянік"	109,4
„Закрашынскі Мох"	99,9
„Ленінскі Шлях"	96,3
„Бальшавік"	89,5
„Новая Беларусь"	84,1
„Давыдаўка"	72,0
„Міханавічы"	68,2
„1-е Мая"	64,8
„Чырвоны Кастрычнік"	58,7
„Шлях Сацыялізму"	56,0
„Ім. Даўмана"	50,7
„Грэбнёва"	49,6
„Зьвязда"	46,7
„Свабода"	46,0
„Смалявічы"	31,4
„Чырвоны Сьцяг"	30,5
„Калектыўная Праца"	14,0
„Вялікі Мох"	12,0
„Рэмізава"	10,6
„Вольніца"	10,0
„Чырвоная Беларусь"	10,0
Усяго па БССР	52,1

Неадкладна скончыць

афармленьне падпіскі і збор першых узносаў

Заданьне выканалі на 6 проц. 70 калгасаў падпіскай не ахоплены

У Пухавіцкім р-не пазыкі «3-ці рашаючы год пяцігодкі» сярод аднаасобнага сэктару рэалізавана толькі на 6 проц. заданьня, а сярод калгасьнікаў—56 проц. Райфа ня кіруе мабілізацыяй сродкаў, у выніку чаго у 70 калгасах з 236 падпіска на пазыку не праведзена.

Рыг Асака.

„Мы пра падпіску ні чога ня ведаем"...

Клічаў. Ня гледзячы на рашучае запатрабаваньне працоўных СССР аб хуткай рэалізацыі дзяржаўнай пазыкі «Трэці рашаючы», райкаса ашчаднасьці да гэтага часу не разгарнула ўдарных тэмпаў па рэалізацыі пазыкі.

6-га верасьня, а 11 гадз. раніцы, у райашчадкасу зьявіўся тав. Марукевіч, каб унесьці першы ўзнос па падпісцы на жніўвень месяц. За сталом ён застаў двух працаўнікоў ашчадкасы. Ён зьвярнуўся да аднаго з іх, каб прынялі ўзнос па пазыцы, але на гэта атрымаў адказ—«Зьвярнецеся да наступнага таварыша, бо я пра падпіску нічога ня ведаю». Тое-ж самае адказаў і другі, дадаючы, што «мы пра падпіску нічога ня ведаем. Вам прыдзецца чакаць Белакурскага, можа ён ведае». Доўгі час чакаў Марукевіч Белакурскага, кантралёра ашчадкасы, і ледзь дачакаўся, але-ж і той кажа, што нічога н ведае.

Трэба пакласьці канец безадказным бюракратычным адносінам да пазыкавай справы. Селькор. Саляўка.

Работнікі Бабруйскай, Асіпавіцкай, Бярэзінскай, Бялыніцкай раймілiцыі, адкажэце на выклік Клічаўцаў

Клічаў. Калектыў працаўнікоў Клічаўскай раймілiцыі, заслухаўшы даклад прафупаўнаважанага групкому міліцыі тав. Кудзелька аб значэньні пазыкі «3-ці рашаючы», адзначаючы, што хуткія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, рэканструкцыя сельскае гаспадаркі і рад іншых мерапрыемстваў партыі і ўраду ў галіне дабрабыту адзінай у сьвеце пралетарскай дзяржавы патрабуюць шмат сродкаў ад саміх працоўных савецкай краіны, парашылі падпісацца на пазыку ня менш як на 100 проц. свайго месячнага заработку. Тут-жа на сходзе была праведзена падпіска, якая дала 2.400 руб. Апроч таго, мы парашылі ўсе вольныя сродкі здаваць у касу ашчаднасьці.

Для садзейнічаньня ў распаўсюджваньні пазыкі і справе дзяржкрэдыту мы абралі камсод, якому даручана праводзіць рэалізацыю пазыкі сярод астатняга насельніцтва. На першы раз камісія атрымала ў касе ашчаднасьці аблігацыі пазыкі на суму 2.000 руб. з тым, каб пасьля распаўсюджваньня гэтай сумы ўзяць дадатковую лічбу і г. д.

Сход работнікаў Клічаўскай раймілiцыі пастанавіў выклікаць на сацспаборніцтва, на хутчэйшае і лепшае распаўсюджваньне пазыкі, калектывы Асіпавіцкай, Бярэзінскай, Бабруйскай, Бялыніцкай раймілiцыі.

Селькор Сачыўка.

Рацыяналізатарскі праект тав. Міхальскага ляжыць пад сукном у кіраўніцтве ашчадкасамі

Галоўны бухгальтар Горашчадкасы тав. Міхальскі распрацаваў праект рацыяналізацыі (дэцэнтралізацыі) Менскай Гарашчадкасы № 16 і пераводу яе на гаспадарчы разьлік. Гэты праект дае вялікую эфэктыўнасьць ў скарачэньні штата, эканомію ў сярэднім 390 руб. у месяц, а ў год 4680 руб., поўнасьцю ліквідуе абезлічку, а таксама паляпшае абслугоўваньне ўкладчыкаў.

Гэты праект быў абгаворан ў калектыве Горашчадкасы, а таксама на тэхнічнай нарадзе пры Кіраўніцтве ашчадкасамі і для дэтальнай апрацоўкі яго была вылучана камісія. На чале гэтай камісіі стаіць намесьнік начальніка Кіраўніцтва ашчадкасамі БССР тав Рабцэвіч, але гэта камісія трымае праект ужо два месяцы і яшчэ не разглядала яго.

Такія адносіны да разгляду рацыяналізатарскіх прапаноў з боку Кіраўніцтва ашчадкасамі БССР, зьяўляюцца зусім недапушчальнымі.

Праект тав. Міхальскага павінен быць зараз-жа апрацован і прасунут ўперад.

Б. Г.

Скарыстаць вопыт Слуцкай райканторы сувязі

Слуцкія работнікі пасьляхова змагаюцца за сваячасовую дастаўку карэспандэнцыі. Нараўлянскі, Парыцкі і Жыткавіцкі раёны яшчэ не перабудавалі работы апарату сувязі

Як перабудоўваецца работа апарату сувязі

Паводле вестак Беларускага кіраўніцтва сувязі, перабудова работы апарату сувязі ў БССР у асноўны скончана. На 5-га верасьня толькі Парыцкі, Нараўлянскім і Жыткавіцкі раёны, яшчэ ня скончылі гэтай перабудовы.

Па БССР налічваецца 4.112 дістаносцаў. Адкрыта пры сельсаветах і буйных калгасах 986 паштовых агэнцтваў. У раёнах будзе працаваць 47 інструктароў, па нагляду за работай пошт, а таксама па распаўсюджваньні друку сярод насельніцтва.

Для перадачы вопыту работы аднаго паштовага пункту ў другі Белкіраўніцтва сувязі будзе склікаць раённыя і куставыя канфэрэнцыі работнікаў апарату сувязі. За час перабудовы работы апарату сувязі, зьнята з работы старых работнікаў—1.443 чал. і на іх месца ўзяты лепшыя ўдарнікі рабочыя і калгасьнікі.

Вынікі перабудовы работы апарату сувязі на Случчыне

Да перабудовы работы апарату сувязі на Случчыне клієнтура атрымлівала газэты і лісты праз 4-5 дзён пасьля таго, як пошта прыбывае ў Слуцак. Большасьць лістоў і газэт прападала. Наогул работнікі апарату сувязі працавалі нядбайна, да клієнтуры адносіліся бюракратычна.

Зараз, калі работа апарату сувязі перабудавана, калі апарат сувязі ўкамплектаваўся лепшымі ўдарнікамі рабочымі і калгасьнікамі, работа мае зусім іншы выгляд.

Зараз клієнтура абслугоўваецца акуратна і сваячасова. Штодзённа, як у цэнтры раёну, таксама і ў аддалённых сельсаветах, насельніцтва атрымлівае газэты і лісты ў той-жа дзень, калі яны прыбываюць у Слуцак. Листаносцы кожнаму падпішчыку здаюць на руки яго газэты, або іншую належачую яму карэспандэнцыю.

Зусім зразумела, што сваячасовае атрыманьне газэт падпішчыкамі павялічае зацікаўленасьць іх у выпісцы газэт. Гэта можна пацьвердзіць тым, што пасьля перабудовы апарату сувязі Случчыны, выпіска газэт у раёне значна павялічылася. Кантрольнае заданьне па выпісцы газэт у раёне перавыкананa на 124 проц.

Сярод лістаносцаў і іншых работнікаў апарату сувязі шырока разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва па лепшым абслугоўваньні клієнтуры.

Адначасова работнікі апарату сувязі Случчыны выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва па лепшай пастаноўцы работы апарату сувязі работнікаў апарату сувязі Капыльскага, Чырвона-Слабодзкага, Старобінскага, Любаньскага, Стара-Дароскага, Пухавіцкага, Рагачоўскага, Асіповіцкага і Бабруйскага раёнаў.

Вось рэальныя вынікі перабудовы работы апарату сувязі. Вопыты работы трэба перакінуць ва ўсе раёны БССР.

М.

Праект па рацыяналізацыі адпраўкі і атрыманьня пошты павінен быць ажыцьцёўлены

У сучасны момант ва ўстановах і ведамствах БССР работа па адпраўцы і атрыманьні карэспандэнцыі ў раёны праводзіцца так, што на гэта затрачваецца шмат працы і матар'ялаў. Кожная ўстанова мае пэўны штат справаводаў і сакратароў, якія клеяць пакеты, запакоўваюць туды карэспандэнцыю для адпраўкі, складаюць сьпісы пакетаў, якія адпраўляюцца, распакоўваюць атрыманыя пакеты і г. д.

У сьнежні месяцы мінулага году быў паданы ў дасьледчую станцыю пры НК РСІ БССР праект аб рацыяналізацыі гэтай справы. Гэты праект узяла ся ажыцьцяўляць Менская кантора сувязі. Па некаторых прычынах гэты праект там заляжаўся і толькі ў жніўні месяцы г. г. Менская кантора пачала праводзіць некаторую падрыхтоўчую работу да ажыцьцяўленьня праекту, зьбіраючы патрэбныя зьвесткі і думкі ведамстваў і ўстаноў БССР

У чым сутнасьць гэтага праекту?

Ва ўстановах г. Менску, якія ня ведуць перапіску з раёнамі БССР карэспандэнцыя не пакуецца. На працягу дня ўсе матар'ялы, якія падлягаюць адпраўцы, за выключэньнем сакрэтных зьбіраюцца ў пэўным месцы, напрыклад у сакратара ўстановы, які два разы ў дзень (а 12 і а 3 гадзіны дню) запакоўвае іх у спэцыяльную папку з назвай ўстановы і гэты пакет здаецца на пошту.

На пошце ў Менску арганізоўваецца сартавальнае бюро, якое пасьля атрыманьня з устаноў папак з карэспандэнцыяй сартуе карэспандэнцыю па раёнах. Тэрміновая карэспандэнцыя ва ўстановах запакоўваецца ў асобную папку і на пошце сартуецца ў першую чаргу і асобна ад звычайнай карэспандэнцыі. Пасьля сартоўкі пошта загатаўляе рад пасылак (тэрміновых і простых) па колькасьці раёнаў.

Такія пакеты-пасылкі з карэспандэнцыяй для раённых устаноў атрымліваюцца раённай поштай, альбо райвыканкомам, дзе пакеты ўскрываюцца і карэспандэнцыя перадаецца адпаведным установам.

Таксама ў раёне (на пошце, альбо ў РВК) зьбіраецца ўся карэспандэнцыя для ўстаноў г. Менску, запакоўваецца ў адзін-два пакеты на адрас Менскай канторы сувязі, дзе карэспандэнцыя з раёнаў сартуецца па адрасох адпаведных устаноў і потым у спэцыяльнай папцы перасылаецца апошнім.

Ажыцьцяўленьне гэтага праекту значна зацягнулася. Неабходна, каб дасьледчая станцыя НК РСІ БССР і Менская кантора сувязі хутчэй правяла яго ў жыцьцё.

Г. Д.

Дэкада чырвонага крыжу-

баявы агляд і праверка дзейнасьці чырвонакрыжных арганізацый

Барацьба за санітарны мінімум—адна з галоўных іншых задач таварыства Чырвонага крыжу

Правесьці дэкаду Чырвонага крыжу па-баявому

З 1-га па 10-га кастрычніка па БССР праводзіцца дэкада Чырвонага крыжу.

Дэкада Чырвонага крыжу павінна стаць баявым аглядам і праверкай сыстэмы чырвонакрыжнай работы. У часе правядзеньня дэкады трэба дабіцца рашучага павароту работы чырвонакрыжных арганізацый на новыя рэйкі, на жорсткую барацьбу і выкарчоўваньне апалітычнасьці, бюракратызму і бяздзейнасьці ў рабоце чырвонакрыжных арганізацый.

Дэкада павінна выявіць наколькі чырвонакрыжныя арганізацыі і іх кіруючыя цэнтры практычна перабудаваліся для выкананьня важнейшых палітычных і гаспадарчых задач, якія выцякаюць з рашэньня XVI зьезду партыі, апошніх пленумаў ЦК і прамовы тав Сталіна, аб карэннай перабудове работы і кіраўніцтва ў новых умовах, у новых абставінах.

Канкрэтна дэкада павінна падагуліць вынікі работы арганізацыі Чырвонага крыжу за 1931 г. у адносінах ўзмацненьня работы і росту таварыства, узмацненьня матар'яльнай грашовай базы, арганізацыйнай падрыхтаванасьці для вырашэньня стаячых перад таварыствам задач санітарнага, абароннага і культурна-бытавога характару.

Усёй гэтай кампаніі павінны быць пададзены канкрэтны і дзейны характар. Увага чырвонакрыжных арганізацый павінна быць згрупавана на рашаючых вучастках работы.

На прадпрыемствах—задачай чырвонага крыжу зьяўляецца адпрацаваньне ўмоў працы і быту, на новабудоўлях —садзейнічаньне замацаваньню сэзонных рабочых, барацьба за санітарна-здаровы быт, у сацыялістычным сэктары вёскі—барацьба за санмінімум, за здаровы быт, садзейнічаньне распаўсюджваньню пазыкі «3-га рашаючага», збору тары, садзейнічаньне здачы прадуктаў на загатоўчыя пункты, разьвіцьцю жывёлагадоўлі.

Дэкада павінна быць шырока скарыстана для замацаваньня саміх арганізацый Чырвонага крыжу.

У часе дэкады неабходна праверыць работу бюро ячэек і ражомаў Чырвонага крыжу асабліва адстаючых з мэтай дапамогі ім у наладжваньні работы.

Трэба скончыць перарэгістрацыю членаў таварыства ўцягнуўшы ў яго новую масу працоўных, галоўным чынам з рабочых і калгасьнікаў.

Трэба больш шырока разгарнуць падрыхтоўку новых кадраў працаўнікоў, разгарнуць арганізацыю новых курсаў сандружын, гурткоў і г. д., трэба разгарнуць працу сеткі камсамольскіх гурткоў першай дапамогі.

У часе дэкады трэба аздаравіць грашовую базу чырвона-крыжных арганізацый, поўнасьцю ліквідаваць запазычанасьць па членскіх узносах.

Падрыхтоўку да дэкады трэба скарыстаць для поўнай рэалізацыі білетаў лётарэі Чырвонага крыжу і чырвонага паўмесяца. На мясцох трэба арганізаваць збор сродкаў у фонды па будовы сансамалёту, фонд Леніна і г. д. Трэба паставіць на належную вышыню працу гаспадарчых прадпрыемстваў Чырвонага крыжу—цырульняў, амбуляторый і г. д.

Асноўным мэтадам правядзеньня дэкады павінна быць ажыцьцяўленьне канкрэтных мерапрыемстваў, якія паказваюць удзел і значэньне Чырвонага крыжу ў сацбудаўніцтве і абароне краіны.

Вакол дэкады трэба мабілізаваць шырокую працоўную грамадзкасьць.

У часе дэкады шырока папулярызаваць задачы Чырвонага крыжу, разгарнуць жорсткую крытыку і самакрытыку недахопаў у рабоце чырвонакрыжных арганіацый.

Трэба скарыстаць у падрыхтоўцы і правядзеньні дэкады мэтады сацспаборніцтва і ўдарніцтва, прэміраваньне лепшых ячэек і актывістаў Чырвонага крыжу.

Борц.

Узмацніць работу т-ва Чырвонага крыжу ў Любаньскім р.

Любаньская арганізацыя Чырвонага крыжу працуе зусім дрэнна. У большасьці сельсаветаў, саўгасаў і калгасаў ячэйкі Чырвонага крыжу не арганізаваны і аб арганізацыі іх ніхто не клапоціцца.

Рэалізацыя білетаў лётарэі Чырвонага крыжу і Чырвонага паўмесяца праходзіць зусім слаба.

Сталага кіраўніцтва ўжо арганізаванымі ячэйкамі Чырвонага крыжу з боку раённага камітэту няма.

Трэба рашуча ўзмацніць работу чырвонакрыжнай арганізацыі ў Любаньскім раёне.

Алесь Шпакоўскі.

Поўнасьцю рэалізаваць білеты лётарэі Чырвонага крыжу і Чырвонага паўмесяца

Прэзыдыумам ЦК Таварыства Чырвонага крыжу і Рэспубліканскай лётарэйнай камісіяй з 25-VIII па 15-IX аб ведчан двухдэкаднік штурму прарываў па рэалізацыі білетаў.

Аднак, ня гледзячы на гэта, райкомы Чырвонага крыжу на мясцох яшчэ ня ўключыліся ў двухдэкаднік. Пералому ў гэтай справе яшчэ няма ў той час, калі да тыражу лётарэі, які адбудзецца ў Менску, засталося менш месяца.

На 1 верасьня плян рэалізацыі білетаў лётарэі выканан толькі на 16,8 проц.

Першымі ў справе рэалізацыі білетаў лётарэі ідуць камітэты: Любаньскі, Пухавіцкі, Чавускі і Магілеўскі, якія перавыканалі ўжо свае заданьні і зараз дапаматаюць адстаючым.

Асабліва адстаюць у рэалізацыі білетаў лётарэі Заслаўскі, Гомельскі, Менскі, Рэчыцкі, Мозырскі, Веткаўскі і Лепельскі раённыя і гарадзкія камітэты. У часе ўдарнага дэкадніка гэтым камітэтам трэба падцягнуцца і мабілізаваць усе сілы з тым, каб застаўшыйся час скарыстаць для поўнай рэалізацыі білетаў.

Гірко.

Арганізавалі дапамогу ў ліквідацыі эпідэміі

Вялікую работу па ліквідацыі дэзынтэрыі ў г. Рагачэве правёў Рагачэўскі райком Чырвонага крыжу. У тэрмінова пабудованым заразным бараку дабраахвотна працавалі па абслугоўваньні хворых 5 дружыньніц. На барацьбу з эпідэміяй мабілізавана ўся сандружына, якая разьбіта на 6 брыгад і кожнай брыгадзе вызначан пэўны вучастак працы.

Брыгады правялі санагляд усіх двароў памяшканьняў, рынку, прадуктаў, студняў, устаноў і г. д., правялі гутаркі з працоўным насельніцтвам па завастрэньні іх увагі на барацьбе супроць антысанітарыі.

Граўнёва.

Арганізацыі Чырвонага крыжу яшчэ ў баку ад практычнай работы па ўвядзеньні санмінімуму

Аднэй з актуальнейшых задач чырвонакрыжнай арганізацыі—зьяўляецца барацьба за санітарную культуру, за ўдараўленьне умоў працы і быту працоўных. Між тым абсьледваньні работы Камітэтаў Чырвонага крыжу, якія праводзіліся па лініі ЦК Чырвонага Крыжу, гавораць аб тым, што ні адзін з камітэтаў і ячэек Чырвонага крыжу не праяўляюць ніякай ініцыятывы ў гэтым напрамку.

Нават зараз калі «Правдой» пачаты рэйд ударнікаў барацьбы за санмінімум, чырвонакрыжная арганізацыя БССР цягнецца ў хвосьце гэтага рэйду і амаль ніякага ўдзелу ў правядзеньні яго ня прымае. З свайго боку ЦК Чырвонага крыжу даў раённым камітэтам таварыства практычныя паказаньні па гэтым пытаньні, у буйнейшых прамысловых цэнтры як Гомель, Рэчыца, Ворша, Бабруйск выязджалі працаўнікі ЦК Чырвонага крыжу для дапамогі, а ўсё-ж такі пералому ў гэтай рабоце яшчэ няма. Аб санмінімуме пагаварылі, напісалі вельмі добрыя пажаданьні і пастановы, але канкрэтна зроблена вельмі мала.

Абсьледваньне двароў, цахоў, сталовак чырвонакрыжнымі арганізацыямі не праведзена, за выключэньнем Гомельскага і Слуцкага раённых камітэтаў, якія ўзьнялі грамадзкую думку навакол гэтага пытаньня і мабілізавалі членаў Чырвонага крыжу на барацьбу за санмінімум. У Гомлі праца вала 2 сандружыны ў колькасьці 60 чалавек па ачыстцы двароў і цэхаў. У Слуцку таксама ў буйнейшых калгасы высланы мэдпасты, якія забясьпечаны аптэчкамі.

Аднак гэтага зусім мала. Абмяжоўвацца ўдзелам у правядзеньні санмінімуму толькі 2-х камітэтаў нельга.

Ужо прайшлі ўсе тэрміны вызначаныя ЦК аб прысылцы вестак удзелу арганізацыі Чырвонага крыжу ў барацьбе за санмінімум, але не адзін з камітэтаў іх не даслаў. Рэйд ударнікаў «Правды» ў барацьбе за санітарна-бытавое паляпшэньне працоўных па БССР праходзіць амаль без практычнага ўдзелу чырвона-крыжных арганізацый.

Пралетарская грамадзкасьць чакае і яна мае права патрабаваць актыўнага і практычнага ўдзелу Чырвонага крыжу ў гэтым рэйдзе.

Чырвоны крыж БССР павінен даказаць, што ён ня толькі словам, але і жывой справай ажыцьцяўляе лёзунг «За санітарную культуру і за здаровы быт».

Г.

Санітарны самалёт павінен і будзе пабудаваны

Таварыствам Чырвонага крыжу ў часе правядзеньня Ўсебеларускай канфэрэнцыі (1928 г.) па пытаньні паляпшэньня ўсяе вайскова-санітарнай працы быў выкінут лёзунг аб пабудове 1-га Беларускага санітарнага самалёту. Штодзённа разгортваючы сваю дзейнасьць у галіне пашырэньня санітарнай пісьменнасьці насельніцтва праз сангурткі, сан. дружыны і медшколы Чырвонага Крыжу, таварыства павінна прыняць таксама актыўны ўдзел і ў стварэньні санітарнай авіацыі, ў пабудове санітарных самалётаў.

Санітарная авіацыя за апошнія гады вельмі разьвілася і шырока ўжываецца ў замежных краінах для абслугоўваньня санітарных патрэб. Але санітарная авіацыя ўжываецца ня толькі ў армії. Яна ўсё шырэй скарыстоўваецца і ў часе мірнай абстаноў

Скарыстаць вопыт перабудовы масавай работы органаў юстыцыі

Вялізарныя посьпехі партыі ў справе будаўніцтва сацыялізму дасягнуты на грунце шырокай актыўнасьці рабочае клясы, якая выразілася ў магутным разьвіцьці сацыялістычных мэтадаў працы,—ударніцтва і соцспаборніцтва, у перабудове работы ўсіх органаў пралетарскае дыктатуры пад лёзунгам мабілізацыі мас за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнае рэканструкцыі народнае гаспадаркі.

Актыўнасьць і працоўны энтузіязм рабочае клясы далі магчымасьць зрабіць карэнны паварот і ў працы органаў Юстыцыі БССР, якія дабіліся ўцягненьня ў савецкае будаўніцтва дзесяткі тысяч працоўных.

У працу органаў Юстыцыі ўцягнута, па далёка няпоўных зьвестках, звыш 50.000 рабочых, батракоў, калгасьнікаў —актыўных беднякоў і серадняковаў, якія прымаюць сыстэматычны ўдзел у штодзённай працы органаў юстыцыі.

Пры дапамозе гэтага 50-тысячнага грамадзкага актыву арганізаваны новыя формы суда, перабудаваны формы і мэтады ўсёй работы органаў Юстыцыі, што дало магчымасьць Н. К. Ю. стаць сыгналізатарам і спраўдным памоцнікам партыі пры выкананьні вялізарных задач сацыялістычнай рэканструкцыі.

Грамадзкі актыў згрупіраваны вакол органаў Юстыцыі, падзяляецца на наступныя групы: 1) **народныя засядацелі; 2) групы садзейнічаньня Пракуратуры; 3) грамадзкія абвінаваўцы і 4) шэфскія брыгады.**

Па няпоўных даных па наркасудам БССР у 1931 г. абрана 27.306 народных засядацеляў.

Паводле даных 20-ці пракурорскіх вучасткаў (усяго па БССР — 57 пракурорскіх вучасткаў) абрана 286 груп садзейнічаньня Пракуратуры, з лікам членаў у гэтых групах 1.401.

Грамадзкіх абвінаваўцаў па 1-ае ступеня 1931 г. было абрана 517.

Новымі формамі суду зьяўляюцца вытворча - таварыскія суды і сельскія (мэстачковыя) суды.

Па маючымся даным усяго абрана членаў вытворча-таварыскіх судоў — 6996, а членаў сельскіх судоў абрана —18.100.

Такім чынам, па далёка няпоўных зьвестках, грамадзкі актыў органаў Юстыцыі складаецца з 54.320 асоб з найбольш актыўных рабочых, батракоў, калгасьнікаў і г. д.

Акрамя гэтага, у органах Юстыцыі працуюць, ажыцьцяўляючы свой работы контроль, рабочыя шэфскія брыгады і рабочыя ў парадку сацыялістычнага памесьніцтва, але матар'ялаў па разгортваньні работы сярод гэтага роду грамадзкага актыву органаў Юстыцыі ў нас ёсьць недастаткова.

Сувязь з грамадзкасьцю ажыцьцяўляецца акрамя таго выездамі калегіі НКЮ на фабрыкі і заводы, нарадамі з рабселькорамі, арганізацыяй брыгад пры правядзеньні той ці іншай кампаніі, а таксама праз справаздачныя даклады і даклады, як па прававых пытаньнях, так і па правадзімых палітычна-гаспадарчых кампаніях.

Такая вялікая колькасьць актывістых рабочых і калгасьнікаў, удзельнічаючых у штодзённай рабоце органаў Юстыцыі, разнастайныя формы арганізацыі гэтай грамадзкасьці, далі новыя магчымасьці большага разгортваньня работы органаў Юстыцыі.

Ня гледзячы на тое, што новыя формы ўцягненьня грамадзкасьці ў работу органаў Юстыцыі, сталі ўжывацца больш шырока толькі ў бягучым годзе, мы маем прыкладныя вынікі ў практычнай рабоце, па выяўленьні хваравітых зьявішч і сацыяльна-небясьпечных дзеяньняў з боку некаторых асоб і ўстаноў (Полацкая, Слуцкая, Рагачоўская і іншыя пракуратуры).

Побач з гэтым, некаторыя судовыя работнікі ў радзе раёнаў ў належнай меры не ацанілі новых форм і мэтадаў масавай работы і яшчэ ня ўявілі сабе выключнага значэньня гэтай грамадзкасьці, ня ўлічылі таго, што без каранной перабудовы ўсёй работы на глебе цясьнейшай сувязі з грамадзкасьцю, усямернага скарыстаньня новых форм работы, органы Юстыцыі з задачамі, ускладзенымі на іх сучасным пэрыядам непасрэднага ўступленьня ў сацыялізм, не справяцца.

Задачай сягоднішняга дню ўсіх работнікаў органаў Юстыцыі зьяўляецца —правільнае скарыстаньне ўсяго гэтага больш як 50-тысячнага грамадзкага актыву, сыстэматычна арганізоўваць яго работу, кіраваць гэтай работай, а таксама максымальна скарыстаць ўсе тыя вялізарныя пераваг; для разгортваньня сваёй работы, якія дае нам гэты актыў, гэтыя новыя формы працы.

Пры сыстэматычным кіраўніцтве вытворча-таварыскімі і сельскімі судамі, узгодненым з прафсаюзамі, пры прыцягненьні да гэтай работы друку, органы юстыцыі са сваімі асноўнымі задачамі — барацьба за новы сацыялістычны быт, новыя сацыялістычныя формы працы, самадысцыпліна працоўных і гэтак далей, безумоўна, справяцца.

Вопыт соцнамесьніцтва, удала праведзены ў цэнтральным апараце НКЮ, павінен быць перанесены на органы Юстыцыі: ўсіх раёнаў БССР, дзе гэтая праца яшчэ амаль не распачата, ня гледзячы на тое, што НКЮ сваечасова даў аб гэтым паказаньні месцам.

Пры максымальнай увазе ўсіх работнікаў Юстыцыі новым формам масавай работы, максымальным разгортваньні работы з грамадзкім актывам і ўцягненьні яго ў практычную работу, органы Юстыцыі з поўным вучасткам працы па пабудове сацыялізму ў нашай краіне, з посьпехам справяцца.

Севасьцюк.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра абслугоўваньне культурнаасьветнымі ўстановамі сацыялістычнага сэктару народнай гаспадаркі

Выслухаўшы даклад Народнага Камісарыяту Асьветы пра культурнаасьветнае абслугоўваньне сацыялістычнага сэктару народнай гаспадаркі Савет Народных Камісараў БССР адзначае наступныя дасягненьні ў галіне абслугоўваньня сацыялістычнага сэктару народнай гаспадаркі:

а) уведзена ўсеагульнае абавязковае навучаньне на базе сямігодкі ва ўсіх прамысловых цэнтрах БССР, у 17 раёнах і 75 сельскіх саветах, якія скончылі ў асноўным калектывізацыю сельскай гаспадаркі;

б) каля 90 проц. масавых школ прымацаваны да прадпрыемстваў, саўгасаў, калгасаў і машынна-трактарных станцый;

в) шпарка разгортваецца вячэрняя рабочая і калгасная асьвета;

г) праводзіцца з гэтага году ліквідацыя малапісьменнасьці рабочых і калгасьнікаў да 35 гадоў ва ўсіх прамысловых цэнтрах, 17 раёнах і сельскіх саветах суцэльнай калектывізацыі;

д) значна палепшана матар'яльная база школ і матар'яльнае забясьпечаньне зучняў.

Побач з гэтым СНК БССР адзначае недастатковыя тэмпы ў абслугоўваньні дашкольным выхаваньнем дзяцей рабочых і работніц прамысловых прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасьнікаў, непрыстасаваньне дашкольных устаноў да пазьменнай працы на прадпрыемствах, незабясьпечанасьць дашкольных устаноў патрэбнымі кадрамі выхавальнікаў, вельмі слабае разгортваньне сеткі палітасьветных устаноў (клюбаў і чырвоных куткоў у горадзе, народных дамоў, хат-чытальняў і чырвоных куткоў у сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі) і недастаткозую якасьць працы гэтых устаноў, якая не забясьпечвае належнага абслугоўваньня сацыялістычнага сэктару народнай гаспадаркі.

Выходзячы з паказанага Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Разгарнуць дашкольнае выхаваньне з такім разьлікам, каб рознымі тыпамі дашкольных устаноў ахапіць у гэтым навучальным годзе ня менш 50 проц. дзяцей дашкольнага веку ў БССР, пры чым дзеці рабочых і работніц павінны быць ахоплены на 100 проц. і дзеці калгасьнікаў і калгасьніц ня менш як на 50 проц., прыстасаваўшы працу дашкольных устаноў да зьменнай працы на прадпрыемствах, у саўгасах і машынна-трактарных станцыях.

2. Значна пашырыць вячэрнюю рабочую і калгасную асьвету праз вячэрнія школы падвышанага тыпу і рабочыя і калгасныя унівэрсытэты, даючы ў гэтых тыпах школ, апроч агульнае асьветы, пэўную кваліфікацыю, увязваючы гэта з задачамі аўладаньня тэхнікаю і выкананьнем прамфінпляну.

3. Лічачы зусім ненармальным, што планы будаўніцтва клюбаў, народных дамоў і хат-чытальняў сыстэматычна ня выконваюцца, прапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы, Дзяржпляну, раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам ужыць заходы да абавязковага скончаньня гэтага будаўніцтва.

Абавязаць Народны Камісарыят Асьветы ўзмоніць і разгарнуць работу так, каб яна цалкам забясьпечвала патрабаваньні сацыялістычнага будаўніцтва, усімі спосабамі скарыстоўваючы грамадзкасьць і ўнутраныя мясцовыя рэсурсы.

4. Даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы і Дзяржпляну распрацаваць і падаць на разгляд СНК пытаньне аб увядзеньні з восені 1932 году ўсеагульнага абавязковага навучаньня на базе сямігодкі і абавязковай ліквідацыі малапісьменнасьці ў сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР. **Г. Грысевіч.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР **С. Кандыбовіч.**

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра рэарганізацыю пажарнай аховы

Для ўпарадкаваньня справы супроцыпажарнай аховы, а таксама для дасягненьня большай плянавасьці ў працы пажарнай аховы, Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Агульнае кіраваньне, плянаваньне і кантроль пажарнай справай усклясьці на Народны Камісарыят Камунальнай Гаспадаркі БССР.

Апэрацыйнае плянаваньне і кіраваньне супроцыпажарнай аховай прадпрыемстваў рэспубліканскай прамысловасьці, падпарадкаванай ВСНГ, усклясьці на ВСНГ, пры чым плян мерапрыемстваў па пажарнай ахове ВСНГ падае Народнаму Камісарыяту Камунальнай Гаспадаркі.

Адказнасьць за супроцыпажарную ахову ўсіх фабрык, заводаў, складаў ведамстваў, устаноў і арганізацый, а таксама саўгасаў і калгасаў ускладаецца персанальна на іх кіраўнікоў і на вызначаных асоб.

2. Аб'яднаньне дзейнасьці ўсіх органаў, пажарнай аховы на мясцох і іх інструктаж усклясьці на органы дзяржаўнай пажарнай аховы Народнага Камісарыяту Камунальнай Гаспадаркі.

3. Заяўкі на пажарны інвэнтар, абсталяваньне і прылады для фабрык, заводаў, складаў і сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі складаюцца адпаведнымі ведамствамі і падаюцца Народнаму Камісарыяту Камунальнай Гаспадаркі, які складае рэспубліканскія пляны забясьпечаньня і разьмеркаваньня.

4. Усе ўстановы і арганізацыі павінны прадугледжваць у сваіх прамфінпляннях і вытворчых праграмах сродкі на ўгрыманьне пажарнай аховы і на набыцьцё пажарнага інвэнтару і абсталяваньня.

5. Кіраўнікі органаў пажарнай аховы фабрык, заводаў, складаў, саўгасаў і калгасаў даюць справаздачы аб сваёй дзейнасьці адміністрацыі сваіх ведамстваў, прадпрыемстваў і устаноў, а таксама органам дзяржаўнай пажарнай аховы Народнага Камісарыяту Камунальнай Гаспадаркі.

6. Для кіраваньня пажарнаю аховаю арганізаваць у складзе Народнага Камісарыяту Камунальнай Гаспадаркі Кіраўніцтва Дзяржаўнай Пажарнай Аховы.

7. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Камунальнай Гаспадаркі выдаць палажэньне аб органах Дзяржаўнай Пажарнай Аховы.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **Г. Грысевіч.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР **С. Кандыбовіч.**

8 верасьня 1931 г.
г. Менск.

Пастанова СНК БССР

пра палепшаньне паштовай сувязі

Для палепшаньня паштовай сувязі СНК БССР **пастанаўляе:**

1. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты на працягу месяца:

а) распрацаваць, з прыцягненьнем раённых аддзелаў сувязі, і зацьвердзіць плян разьвіцьця і палепшаньня паштовай сувязі з вёскамі, калгасамі, саўгасамі і МТС, прадугледзеўшы ад чыненьне паштовых агэнцтваў у сельскіх саветах, а таксама ў саўгасах і машына-трактарных станцыях;

б) устанавіць дастаўку газэт і паштовых адпраўленьняў з раённага цэнтру ў вёскі, калгасы, саўгасы і машына-трактарныя станцыі з такім разьлікам, каб яны маглі быць атрыманы і дастаўлены сялянскім двором на працягу аднаго дня, а ў далёкіх вёсках—не пазьней другога дня;

в) забясьпечыць транспартам дастаўку пошты і газэт з раённага цэнтру ў сельскія саветы, калгасы, саўгасы і машына-трактарныя станцыі, а таксама падвозку пошты з раённага цэнтру для сувязі з рэспубліканскім цэнтрам па цэнах, устаноўленых па каштарысу раённага аддзелу сувязі і зацьверджаных Упаўнаважаным Народнага Камісарыяту Пошт і Тэлеграфу з Белкалгасцэнтрам.

2. Для выкананьня памянёнага пляну работы пошты:

а) прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам даць пад паштовыя аддзяленьні і агэнцтвы патрэбныя памяшканьні, якія-б забясьпечвалі надзейнае захаваньне паштовай карэспандэнцыі, каштоўнасьцяй і грошай;

б) перадаць раённым аддзелам сувязі транспартныя і грашовыя сродкі і памяшканьні, якія скарыстоўваюцца асобнымі ўстановамі на паралельную пошту.

Калі гэтых сродкаў, а таксама сродкаў раённага аддзелу сувязі не хапае, прыцягваць да перавозак пошты калгасы і аднавсобнікаў, заключаючы з імі адпаведныя дагаворы;

в) у паселішчах, калгасах, саўгасах і машына-трактарных станцыях, якія ня маюць паштовых скрынак, устанавіць іх за кошт гэтых арганізацый па ўзорах, зацьверджаных Народным Камісарыятам Пошт і Тэлеграфу, а таксама ўстанавіць продаж паштовых марак.

3. Даручыць раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам разглядзець і зацьвердзіць кантрольныя тэрміны дастаўкі газэт і паштовых адпраўленьняў.

4. Абавязаць домакіраўніцтва і ЖАКТы ўстанавіць абавязковыя шафы ў пад'ездах дамоў для таго, каб пісьманосцы мелі магчымасьць рабіць дастаўку газэт і лістоў без усялякай затрымкі.

5. Даручыць раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам сыстэматычна выслухоўваць даклады органаў сувязі, а таксама зацьвярджаць гадавыя і пэрспэктыўныя пляны гэтых органаў.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **Г. Грысевіч.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР **С. Кандыбовіч.**

8 верасьня 1931 г.
г. Менск.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Якое будзе надвор'е

На працягу восені да 25-га кастрычніка па Беларусі чакаецца перавага цыклёнічнага ветранага надвор'я з пераходнымі досыць значнымі ападкамі. Чакаюцца часовыя перапынкі ў цыклёнічным надвор'і ў выглядзе пэрыядаў да 8 дзён—яснага, але ветранага надвор'я з пахаладаньнямі. Гэтыя пэрыяды будуць характарызавацца тым, што пры паслабленьні ветру па Беларусі будуць наглядацца туманы.

Паміж 8 і 20 верасьня чакаецца рэзкае пахаладаньне ў паўночнай палове эўралэйскай часткі Саюзу, якое ўзмоцніцца паміж 15 і 20 верасьня і адб'ецца ў выглядзе некаторага пахаладаньня ў гэты час на тэрыторыі Беларусі.

Каля 25-га верасьня, у канцы верасьня, у пачатку кастрычніка і каля 8-га кастрычніка па Беларусі пройдзе хваля халоднага паветра арктычнага паходжаньня, якія дадуць значнае пахаладаньне.

Даць па руках прасьлядоўцам чырвонага партызана т. Каршака

У вёсцы Міханавічы Кайкаўскага сельсавету, Менскага раёну чырвоны партызан тав. Каршак П. прасьледаваецца сельсаветам. На яго зваротыў адпаведныя органы аб прыняцьці мер да сельсавету, нехто ня зварочваў увагі. Аб прасьледваньні сельсаветам т. Каршака сьведчаць наступныя факты. Калі ў мінулым годзе тав. Каршак плаціў падатку 35 руб., дык у гэтым годзе на яго сельсавет наклаў 138 руб. Ільготы, якія прадастаўляюцца былым чырвоным партызанам, тав. Каршак не атрымлівае.

Каршак вымушан быў падаць заяву пракурору рэспублікі і пракурор нала жыў наступную рэзалюцыю на яго заяве: **«Менскаму пракурору т. Шніцко выслухаць т. Каршака і вырашыць яго справу».** Каршак зьвярнуўся да Менскага пракурора, але апошні замест вырашэньня справы яму заявіў: **«Ідзі ў калгас, а зараз мне да цябе справы няма».** Нарэшце Каршак пайшоў да інспэктара Гарфа т. Гінкука, які накіраваў яго заяву Кайкаўскаму сельсавету на вырашэньне. Але-ж калі Каршак зьвярнуўся ў сельсавет, дык таксама па справе нічога не дабіўся апроч слоў: **«Улада на мясцох, што зробіць на гэтым і кропка, а за нявыкананьне вы будзеце адданы пад суд».**

Каршак мае 4 га зямлі, а плаціць падатак за 8 га. Таксама і з іншымі аб'ектамі.

Адпаведныя органы, а ў прыватнасьці Менскі Пракурор павінны тэрміново дэталёва высьветліць справу тав. Каршака і вінаватых у прасьледваньні апошняга прыцягнуць да суровай адказнасьці.

А. К.

Пра пэрспэктывы вытворчасьці камбінаваных кармоў і пра пабудову заводаў па вырабе гэтых кармоў

З мэтай зьмяншэньня дэфіцыту ў канцэнтраваных кармох, а таксама максымальнага скарыстаньня прыгодных для корму адкідаў прамысловасьці, СНК прапанаваў НК Снабжэньня неадкладна прыступіць да разьвіцьця ў БССР прамысловасьці камбінаваных кармоў і пабудовы заводаў па вырабу гэтых кармоў.

Для максымальнага эфэктыўнага скарыстаньня маючыхся кармоў адкідаў прамысловасьці, палевога траваценьня і адкідаў грамадзкага харчаваньня, гэтыя заводы будаваць у гарадох, буйных саўгасах і калгасах. НК Снабжэньня прапанавана на працягу месяца падаць праз Дзяржплян на зацьверджаньне Эканомсавету плян будаўніцтва заводаў па вырабу камбінаваных кармоў на 1932 г.

СНК лічыць неабходным прыступіць да будаўніцтва яшчэ ў гэтым годзе аднаго заводу па вырабу камбінаваных кармоў. Белкаапсаюзу прапанавана на працягу 1931-32 г. пабудаваць заводы па вырабу камбінаваных кармоў у г.г. Менску, Гомелю, Віцебску і Магілёве.

СНК абавязаў Навукова-Дасьледчы інстытут сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, НДІ Сьвінага доўлі і Беларускую Малочную Заналную Станцыю неадкладна распрацаваць рэцэптуру для камбінаваных кармоў, выходзячы з мясцовай сыравіны, а таксама правесьці вопыт з камбінаванымі кармамі з мэтай вывучэньня перапрацоўваньня жывёлай і іх прадукцыйнай эфэктыўнасьці.

Беларускаму Аддзяленьню Саюзпрамкорму СНК даручыў распрацаваць стандартныя тыпы заводаў па вырабу камбінаваных кармоў для саўгасаў і калгасаў, з разьлікам пабудовы ў 1931-32 г. гэтых заводаў у саўгасах і калгасах.

Белта.

Тав. Галадзед зьвярнуўся з адпачынку

Зьвярнуўся з чарговага адпачынку старшыня Савету Народных Камісараў БССР тав. Галадзед М. М. і прыступіў да выкананьня сваіх абавязкаў.

Ідуць чырвоныя абозы

Калгасы Цараўскага сельсавету, Слуцкага раёну «Бальшавік», «Селянин» і «Камінтэрн» 25 жніўня арганізавалі чырвоны абоз у 150 падвод і здалі дзяржаве 60 тон збожжа.

А. КУРДО.

ПАПРАЎКА.

У пастанове Камісіі выкананьня пра ход будаўніцтва Гомельскага маргарынавага заводу, зьмешчанай у «Сав. Бел.» № 206, у пункце 3 пасьля слоў: «Тав. Думбергу», замест 32 году, трэба чытаць—«31 году».

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Пакпаліся ка самацёк

Дырэктывы ЦК КП(б)Б аб падрыхтоўцы да новага навучальнага году не знайшлі практычнага праламленьня ў рабоце чавускіх арганізацый. Справа падрыхтоўкі да дню вучобы прадастаўлена самацёку. Райінспэктара ў раёне няма, бо ранейшага перакінулі на іншую работу, а новага работніка не далі. Савет культурнага будаўніцтва не арганізаваны.

Вучоту дзяцей школьнага ўзросту не праводзілася, а таму невядома, дзе ад чыняць новыя камплекты. Памяшканьні для апошніх не падрыхтаваны. Аплам школы зусім не забясьпечаны.

Брыгадзір «Сав. Бел.» Юрка Лявоны.

ТЭАТР-КІНО-ЦЫРК

МЕНДЗЯРЖ-ТЭАТР — Гастролі муз. камэдыі пад кіраўніцтвам Міраева **РОЗ-МАРЫ** Апошні раз. Продаж білетаў у рабочай касе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.

ДЗЯРЖЦЫРК — Лепшыя ў СССР Кіко Дасці, жанчына ілюзіяністка. Заслужаны артысты ССРГ бр. Танці. Муз. сат. заслужаная артыстка Вольга Маява. Жанглёры-малабарыстых Бэ,ман і Мацблян. Лепшыя ў СССР атрацыёны-суцьветы рэнко-д-плаваньне ў паветры 6 Эльворці 6. Вышэйшае дасягненьне эквілібрыстыкі 2 Голядзе 2. 5 Бэ адэ 5 акрабаты. Турністы 3 Мірэ 3. Новая група дрэсыроўкі коней А. В. Лапіда. Выезд непалыпяковых навеньніку жанраў 4 КУК 4. Музычны інструментальісты Вероніка. Выезд и езьніка Первіль. Спарт. акрабаты Веомаш. Універсальныя артысты бр. МАКЕЕВЫ. Каса ад 12 гадз. дня. Білеты са скідкай у рабочай касе. Пачатак а 9 гадз.

Кіно-тэатр Культура — З 10 верасьня вялікі замежны мастацкі фільм вытворчасьці амат ўс.—фільм. вып. 1931 г. „Шчасьце матулі Кітэ“ ў 7 част. Рэж. і апэр. Піль-Ютун.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“ — З 5-га верасьня замежны фільм Поля Нэгрі **„Калючы дрот“** Каса з 12 гадзіне.

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ“ — **ПАДАЗРОНЫ БАГАЖ**

„Чырвоная Зорка“ — З 5-га верасьня **ЦІХІ ДОН** па выд. Шолахава. Звыш праграмы. Буравесьнік. Каса з 5 гадз. Цэны паніжаны.

На 12 верасьня г. г. а 7-й гадз. увечары Наркамфінсаюзы БССР (у Гаспрэце Наркомфіна — Чырвонармейская вул., 16, 3 ці паверх)

СКЛІКАЕ ПАШЫРАНУЮ НАРАДУ

ПА ПЫТАНЬНІ: увядзеньня ўніфікацыі і прэміяльна-зьдольнай аплаты працы ў кіруючым і рахунковым апараце, з наступным парадкам дня:

1. Становішча і бліжэйшыя задачы кіраўнічага апарату ў народнай гаспадарцы:

а) даклады з месц бліжэйшэрэчаных арганізацый аб становішчы справаздачнасьці;

б) абгаварэньне праэкту Наркамфінсаюзу па практычным ажыцьцяўленьні новых форм і мэтодаў працы кіраўнічага апарату.

На нараду запрашаюцца—кіраўнікі ўстаноў, дырэктары, галоўбухі (абавязкова), рацыяналізатары і прадстаўнікі ТНБ, наступных прадпрыемстваў і устаноў:

Зав. „Варашылава“, „Бальшавік“, „Акцябр“, „Дрэваапрацоўшчык“—НКФ, Лесбелу, Белкаавісаюзу, Белсольтрэсту і Менскай канторы Дзяржбанку.

На нараду таксама запрашаюцца прадстаўнікі НК-РСІ, ЦСПСБ, Дзяржпляну, і рэдакцый газэт.

Наркамфінсаюзы БССР БАСКІН

КЛІМАВІЦКІ ФЗВ

АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ НАБОР

на мэханічнае і будаўнічае аддзяленьні

ПРЫЁМ ЗАЯЎ ДА 25-IX 31 г.

Заявы накіроўваць па адрасу: Клімавічы БССР, прыймовай камісіі ФЗВ

ПАЧАТАК ЗАНЯТКАЎ З 1-X 1931 году

Загадчык ФЗВ

Пастанова НКП СССР ад 26-га ліпеня 1931 г.

Аб справаздачнасьці руху сельскага насельніцтва

Для высьвятленьня колькасьці рабочых, якія могуць быць дадаткова прыцягнуты з сельскіх мясцовасьцяй для работы ў розных галінах народнай гаспадаркі НКП СССР на падставе арт. арт. 12 і 13 пастановы ЦВК і СНК СССР ад 30 красавіка 1927 году «Аб парадку прадстаўленьня справаздачнасьці дзяржаўнымі органамі, каапэрацыйнымі арганізацыямі і акцыянэрнымі таварыствамі з удзелам дзяржаўнага і каапэрацыйнага капіталу» (З. З. СССР 1927 г.—26 арт. 278) пастанавіў:

1. Усе праўленьні калгасаў абавязаны прадстаўляць у сельсаветы зьвесткі аб руху насельніцтва ў калгасах па прыкладанай форме інструкцыі (дадатак № 1 і 2).

Не пазьней 20-га жніўня 1931 году праўленьні калгасаў абавязаны прадставіць гэтыя зьвесткі за 1-е паўгодзьдзе 1931 г. (Студзень-чэрвень) і паасобна за ліпень 1931 г.

У далейшым гэтыя зьвесткі павінны прадстаўляцца штомесячна не пазьней 2 дзён пасьля справаздачнага месяцу (за жнівень—2 верасьня, за верасень—2 кастрычніка і г. д.).

2. Усе сельсаветы абавязаны прадстаўляць у райвыканкомы (райпляны) зьвесткі аб руху сельскага насельніцтва (калгаснага—па зьвестках атрыманых ад калгасаў, а таксама і некалгаснага) па прыкладзенай форме і інструкцыі (дадатак №№ 3 і 4).

Не пазьней 20 жніўня 1931 г. сельсаветы абавязаны прадставіць гэтыя зьвесткі за 1-ае паўгодзьдзе 1931 г. (Студзень-чэрвень) і паасобна за ліпень 1931 г.

У далейшым гэтыя зьвесткі павінны прадстаўляцца штомесячна не пазьней 5 дзён пасьля справаздачнага месяца (за жнівень—5 верасьня, за верасень—5 кастрычніка і г. д.).

3. Райвыканкомы (райпляны) атрымаўшы зьвесткі ад сельсаветаў здымаюць з іх копіі пакідаюць гэтыя копіі ў сябе, а арыгіналы зьвестак адсылаюць: а) у РСФСР--у вобласны аддзел працы (краёвы аддзел працы, НКП аўтаномнай рэспублікі, якая не ўваходзіць у склад вобласьці ці краю); б) у ЗСФСР--у НКП Азербайджана, Арменіі ці Грузіі; в) у астатніх Саюзных Рэспубліках--у НКП Саюзнай Рэспублікі.

Зьвесткі адсылаюцца па атрыманьні іх ня менш, чым ад 50 проц. сельсаветаў, толькі не пазьней 20 дзён пасьля справаздачнага пэрыяду. Зьвесткі паступіўшыя пазьней, адсылаюцца дадаткова не пазьней месяца пасьля справаздачнага пэрыяду.

4. Органы працы, паказаныя ў арт. 3, атрымаўшы зьвесткі ад райвыканкомаў, складаюць абласныя ці рэспубліканскія зводкі па формах распрацованых таблиц (якія рассылаюцца дадаткова). За 1-е паўгодзьдзе 1931 г. складаецца зводка, а ў далейшым складаюцца квартальныя зводкі.

Зводкі высылаюцца: а) па РСФСР--у НКП РСФСР; б) па ЗСФСР--у НКП ЗСФСР; в), а па астатніх Саюзных Рэспубліках--у НКП СССР.

Зводкі адсылаюцца ў гэтыя органы не пазьней 35 дзён пасьля справаздачнага пэрыяду.

НКП РСФСР і НКП ЗСФСР адсылаюць зьвесткі ў НКП СССР згодна паасобных тлумачэньняў НКП СССР.

5. Райвыканкомы (райпляны) і органы працы пры правядзеньні гэтай пастановы абавязаны захоўваць дадатковыя тлумачэньні па арганізацыі справаздачнасьці аб руху сельскага насельніцтва (дадатак № 5).

6. Парушэньні гэтай пастановы прасьледваюцца ў наступным парадку:

а) Парушэньні, якія маюць прызнакі злачынства, прасьледваньня ў судовым парадку, прасьледуюцца ў крымінальным парадку па заканадаўству Саюзных Рэспублік.

б) Іншыя парушэньні прасьледуюцца ў адміністрацыйным парадку шляхам наложэньня штрафу ў разьмеры ня звыш 100 руб. па пастанове ЦВК СНК СССР ад 2-га студзеня 1929 г. аб мерапрыемствах па барацьбе з парушэньнямі заканадаўства аб працы. (З. З. СССР, 1929 г. № 4 арт. 31, «Известия» НКП СССР 1929 г. № 7-8).

7. Адмяняецца аддзел «В» разьдзелу 1-га пералікі форм па-за ведамственнай статыстычнай справаздачнасьці па працы, якая прадстаўляецца прадпрыемствамі і ўстановамі ў органы працы (дадатак 1-м да пастановы НКП СССР ад 4 верасьня 1929 г. № 290—«Известия» НКП СССР, 1929 г. № 30—39.

Нам. Нар. Кам. Працы Кравель.

Член Калегіі НКП СССР Дубнэр.

Заг. Статсэктарам НКП СССР Сікра.

Тлумачэньні па арганізацыі справаздачнасьці аб руху сельскага насельніцтва

1. Райвыканкомы (ў асобе статыстыкаў райпляну) пад кіраўніцтвам раённага інспэктара працы):

а) забясьпечваюць сельсаветы атрыманымі ад органаў працы бляшкамі і інструкцыямі да іх запаўненьня (інструкцыі да запаўненьня бляшкаў зьмешчаюцца на звароце самага бляшку).

б) Праводзяць адначасовы вусны інструктаж прадстаўнікоў сельсаветаў шляхам скліканьня спэцыяльных нарад перад пачаткам работы, а таксама інструктуюць іх у бягучым парадку па меры неабходнасьці;

в) сочаць за паступленьнем запоўненых бляшкаў ад сельсаветаў, вядуць ім асобную рэгістрацыю і параўнюць іх з маючымися сыпскамі сельсаветаў;

г) Правяраюць паступаючыя ад сельсаветаў запоўненыя бляшкі з пункту погляду паўнаты і пэўнасьці маючыхся ў іх зьвестак і выпраўляюць няправільна запоўненыя бляшкі, для чаго высьвятляюцца памылкі і нячоткасьці ў бляшку як шляхам спэцыяльных запытаньняў сельсаветам, так і шляхам асабістага апытаньня старшынь сельсаветаў.

д) Пасьля праверкі і ўдасканаленьня паступіўшага ад сельсавету бляшку здымаюць з яго копію, пакідаючы яе ў раёне для патрэб райпляну і раённага органу працы.

е) Арыгіналы бляшкаў накіроўваюць у парадку, паказаным у арт. 3 пастановы НКП СССР ад 26 ліпеня 1931 г. № 215 аб справаздачнасьці аб руху сельскага насельніцтва.

2. Раённыя інспэктары працы:

а) сочаць за свячасовай арганізацыяй і за складаньнем работы ў раёне па справаздачнасьці аб руху сельскага насельніцтва;

б) на аснове інфармацыі, райстатыстыкаў прыцягваюць да адказнасьці работнікаў сельсаветаў, якія не прадстаўляюць свячасова справаздачнасьці;

в) наглядаюць за свячасовасьцю і поўнатой адсылкі з раёнаў у адпаведны вышэй стаячы орган працы арыгіналаў справаздач сельсаветаў.

3. Вобластныя аддзелы працы РСФСР, краёвыя аддзелы працы, НКП аўтаномных рэспублік НКП Азербайджана, Арменіі і Грузіі—ЗСФСР і НКП астатніх рэспублік;

а) сочаць за паступленьнем ад райвыканкомаў запоўненых бляшкаў сельсаветаў і вядуць ім спэцыяльную рэгістрацыю;

б) разглядаюць паступіўшыя бляшкі з пункту погляду паўнаты і пэўнасьці зьмешчаных у іх зьвестак, зварочваючы ў прыватнасьці ўвагу на правільнасьць запаўненьня зьвестак аб колькасьці насельніцтва і ў выпадку няправільнага запаўненьня бляшкаў, зварочваюць іх у раён для праверкі і перараскладаньня;

в) складаюць зводкі і накіроўваюць іх у парадку, паказаным у рт. 4 пастановы НКП СССР ад 26 ліпеня 1931 г. № 215 аб справаздачнасьці аб руху сельскага насельніцтва.

4. Забясьпечэньне бляшкамі і інструкцыямі да іх запаўненьня, а таксама агульнае кіраўніцтва пастановкай і арганізацыйнай справаздачнасьці аб руху сельскага насельніцтва ажыцьцяўляюцца НКП Саюзных рэспублік.

Заг. статсэктарам Плянавага кіраўніцтва НКП СССР Сікра.

12-X г. г. а 7 гадзіне ўвечары ў Доме Працаўнікоў Асьветы (Камуністычная, 19)

АДБУДЗЕЦЦА АБ'ЯДНАНАЕ ПАСЕДЖАНЬНЕ

калегіі НКА і прэзыдыуму ЦП Працаўнікоў Асьветы

ПАВЕСТКА ДНЮ:

Мерапрыемствы па рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе

На паседжаньне запрашаюцца: а) прафактыў саюзу Працасьветы, б) заг. школ, тэхнікумаў і ВУЗА'ў, в) прадстаўнікі фабкомаў і заўкомаў тых фабрык і заводаў, да якіх прымацаваны школы, г) прадстаўнікі рэдакцый газэт, д) прадстаўнікі ЦК КСМ і Гаркому КСМ.

БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ СЬВІНАВОДКАЛГАСЦЭНТРУ СССР

АБВЯШЧАЕ ПРЫЁМ

ва ўноў арганізаваныя: Дрыбінскі Сьвінагадоўчы і Круглянскі Вэтэрынарны Тэхнікумы з 2 з паловай гадоў. тэрмінам навучаньня

Прымаюцца асобы, скончыўшыя 7-мі годку, альбо маючыя адпаведную падрыхтоўку.

Заявы накіраваць у Сьвінагадоўчы Тэхнікум—мест. Дрыбін Горацкага раёну і ў вэтэрынарны—мест. Круглае Талачынскага раёну (да заявы трэба прыкласьці даведку аб сацыяльным становішчы, адукацыі і ўзросьце).

Залічаныя студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй.

Заявы прымаюцца да 15 кастрычніка

Заг. Бел. Аддз. Сьвінаводкалгасцэнтру СССР КРАСОЎСКІ